ЗВЯЗДОЎСКАЯ ПАМЯЦЬ

7

СТОЙКАСЦЬ ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯ

8

ВЕЧНА ЖЫВІ І КВІТНЕЙ, БЕЛАРУСЬ!

ЗВЯЗДА

2 ЛІПЕНЯ 2024 г.

АЎТОРАК

№ 127 (30261)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

НАША ГАЛОЎНАЕ СВЯТА

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Днём Рэспублікі) і 80-й гадавінай вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Гэта свята сваёй веліччу і духоўнай сілай звязала разам пераемнасць шматвяковых традыцый, ратную і працоўную доблесць і сучасныя дасягненні нашага народа.

Вызваленне Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў усяліла ў беларусаў ўзнёслую радасць і ўпэўненасць ва ўстанаўленні міру на роднай зямлі, прадвызначыла поўнае вызваленне Беларусі ад гітлераўскіх акупантаў і назаўсёды стала нацыянальным сімвалам свабоды і незалежнасці.

Няскораная Радзіма, якая знішчыла агрэсара, адрадзілася з руін, пераадолела цяжкія наступствы бязлітаснай вайны і сёння годна рухаецца наперад па суверэнным шляху развіцця.

Мы смела глядзім у заўтрашні дзень і зробім усё, каб нашчадкі ганарыліся намі, як мы ганарымся пакаленнямі беларусаў, якія, не шкадуючы сябе, станавіліся на абарону Айчыны, самаддана працавалі і верылі ў шчаслівую будучыню сваіх дзяцей і ўнукаў.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, дабра і дабрабыту. Няхай у вашых дамах будзе светла і ўтульна, а ў кожнай беларускай сям'і пануюць гармонія і згода.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота БелТА.

Наша сіла — у праўдзе, адзінстве і патрыятызме

Урачыстыя мерапрыемствы ў гонар 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прайшлі ў Маскве

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый Крутой усклаў вянок ад пасольства Беларусі ў Расіі да Магілы Невядомага Салдата каля Крамлёўскай сцяны ў Маскве. У цырымоніі ўзялі ўдзел дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, прадстаўнікі МЗС Расіі, інтэграцыйных структур, беларускія дыпламаты. Удзельнікі цырымоніі ўсклалі кветкі да памятных знакаў «Горад-герой Мінск» і «Брэсцкая крэпасць-герой», устаноўленых на алеі гарадоў-герояў у Аляксандраўскім садзе. Цырымонія завяршылася ўрачыстым маршам роты ганаровай варты пад гукі ваеннага аркестра.

«Для мяне вялікі гонар завяршыць работу ў якасці пасла Беларусі ў Расіі на Краснай плошчы, каля Магілы Невядомага Салдата ў сувязі з такім знамянальным для нашай краіны днём — 80-годдзя вызвалення ад нацыстаў, нашым Днём Незалежнасці», — сказаў журналістам Дзмітрый Крутой. Ён расказаў, што самым яркім ураннем за два гады працы паслом стала сумесная работа па патрыятычным выхаванні, якую праводзілі Беларусь і Расія. «Калі шчыра, я быў вельмі здзіўлены ўзроўнем і ўздымам такога патрыятызму ў Расіі, аднаўленнем гістарычнай памяці аб гістарычных падзеях, якасці шматлікіх мемарыялаў, прысвечаных і партызанам, і падпольшчыкам, і нейкім важным бітвам», — сказаў Дзмітрый Крутой. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта



таксама адзначыў, што вялізны пласт матэрыялаў, у тым ліку ў рамках расследавання Генпракуратуры па справе аб генацыдзе беларускага народа, яшчэ не даследаваны. Гэтыя матэрыялы патрабуюць апрацоўкі і асэнсавання.

СТАР. 2

Святочнае

Уладары мірнага жыцця і шчасця

Заўтра наша краіна будзе святкаваць сваё галоўнае дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці. Гістарычна яно звязана з вызваленнем Мінска ў гады вайны. Глыбінны сэнс свята — подзвіг нашых продкаў быў недарэмным, мы шануем яго, памятаем і дзякуем. Дзякуем самім сваім жыццём — годным і шчаслівым. Адна з галоўных прыкмет апошняга — беларускія сем'і. Сімвалічна, што напярэдадні Дня Незалежнасці ва ўсіх абласцях завяршыліся абласныя этапы такога прыгожага, вясёлага і шчымлівага конкурсу — «Уладар сяла», адным з галоўных арганізатараў якога з'яўляецца БРСМ. Адразу пасля Дня Незалежнасці адбудзецца фінал на ўзроўні рэспублікі. Праект гэты, накіраваны на замацаванне маладых сем'яў на сяле, павышэнне прэстыжу вясковых прафесій і ўмацаванне сямейных каштоўнасцяў, стаў нечым большым — сведчаннем магчымасцяў нашай краіны. Магчымасцяў жыць шчасліва, мірна, творча. Годна зарабляць, развівацца, ствараць вялікія і дружныя сем'і. Быць запатрабаванымі. Гэта відавочны аповед пра маладых людзей і дзяцей, якім хораша разам і тут, на зямлі, за якую змагаліся іх прадзеды. Напэўна, лепшую падзяку цяжка прыдумаць. Бо кожная сям'я — гэта цуд любові. Гэта — само жыццё. Гэта — будучае Беларусі.

СТАР. 5

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Францыі пачаліся беспарадкі на фоне выбараў у парламент

Па даных МУС Францыі, у першым туры датэрміновых парламенцкіх выбараў правая партыя «Нацыянальнае аб'яднанне» і яе саюзнікі атрымалі 33,15 % галасоў, левы альянс «Новы народны фронт» — 27,99 %. Прэзідэнцкая кааліцыя «Разам за рэспубліку» аказалася толькі на трэцім месцы з 20,03 % галасоў. Нягледзячы на тое што вырашальным будзе другі тур выбараў, прызначаны на 7 ліпеня, ужо сёння відавочны поспех «Нацыянальнага аб'яднання» на чале з Мары Ле Пэн і правал «Разам за рэспубліку» Эмануэля Макрона.

Як заўважыла газета Le Figaro, роспуск парламента прывёў да «грамадзянскага выбуху». Па сутнасці, сёння адбываецца крах макранізму, і ўсе намаганні дзейнага прэзідэнта перашкодзіць прасоўванню правых да ўлады пайшлі прахам. Па меркаванні экспертаў, з-за палітычнай авантуры з правядзеннем датэрміновых выбараў французскія грамадзяне, расчараваныя палітыкай Макрона, не бачаць іншага выйсця, як падтрымліваць «крайнія» партыі. Сам жа палітык, нягледзячы на аслабленне свайго ўплыву на ўнутраную палітыку краіны, сыходзіць у адстаўку не збіраецца, што можа справакаваць чарговы віток пратэстаў і насілля ў Францыі.

Каментуючы лідарства правых на выбарах, прэс-сакратар Прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў заявіў, што гэтыя вынікі адлюстроўваюць агульнаеўрапейскія тэндэнцыі.

У Іране 5 ліпеня пройдзе другі тур датэрміновых прэзідэнцкіх выбараў

У першым туры ніводны з кандыдатаў не набраў неабходнай колькасці галасоў для пераканаўчай перамогі. У другі тур выйшлі рэфарміст Масуд Пезешкіян і кансерватар Саід Джалілі. Агульная яўка выбаршчыкаў склала менш чым 40 %. На прэзідэнцкіх выбарах 2021 года, на якіх быў абраны Раісі, яўка склала 42 %, а на сакавіцкіх парламенцкіх выбарах — 41 %.

Заканадаўства Ірана патрабуе, каб пераможца атрымаў больш як 50 % усіх пададзеных галасоў. У адваротным выпадку два лідзіруючыя кандыдаты выйдуць у другі тур, які павінен адбыцца праз тыдзень пасля першага. Усяго ў гісторыі Ірана быў толькі адзін другі тур прэзідэнцкіх выбараў: у 2005 годзе, калі прыхільнік жорсткай лініі Махмуд Ахмадзінежад атрымаў перамогу над былым прэзідэнтам Алі Акбарам Хашэмі Рафсанджані.

ISSN 1990 - 763X

КАРОТКА

• Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфер.

• Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Пяткевіч прадставіла калектыву Мінгарвыканкама, кіраўніцтву сталічных прадпрыемстваў, арганізацый і раённых адміністрацый новага памочніка Прэзідэнта Беларусі — інспектара па горадзе Мінску Юрыя Фралова.

• Узровень гранічных рознічных цэн на аўтабензіны і дызельнае паліва з 2 ліпеня 2024 года павялічваецца на 1 капейку.

• Наведванне лясоў забаронена ў 16 раёнах Беларусі, у астатніх абмежавана.

• Установы аховы здароўя Віцебскай вобласці атрымалі больш за два дзясяткі новых аўтамабіляў для аказання меддапамогі ў вёсцы.

Па палічках

НОВЫЯ НАЗВЫ, ІНШЫ ЗМЕСТ

Што мяняецца ў сацыяльным абслугоўванні з ліпеня?

З 1 ліпеня ўступае ў сілу абноўлены Закон «Аб сацыяльным абслугоўванні». Цяпер дамы-інтэрнаты атрымалі новыя назвы, а пажылыя людзі ды інваліды атрымаюць пры неабходнасці магчымасць доўгатэрміновага догляду дома. Пашырыліся магчымасці атрымання сацыяльных паслуг, у прыватнасці, цяпер гэта можна зрабіць дыстанцыйна, таксама прадугледжаны падвоз пажылых людзей і інвалідаў да сацыяльных устаноў. Падрабязней пра тое, што мяняецца ў сацыяльным абслугоўванні з ліпеня, расказалі спецыялісты.

ПАНСІЯНАТЫ ЗАМЕСТ ІНТЭРНАТАЎ

Як паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына КАЛЯДА**, за апошняе дзесяцігоддзе колькасць грамадзян, старэйшых за 65 гадоў, вырасла больш чым на 200 тысяч чалавек і сёння складае больш за 1,5 мільёна.

— Дэмаграфічныя працэсы ў краіне характарызуюцца старэннем насельніцтва, і гэта доўгатэрміновы трэнд, які будзе толькі нарастаць. За апошнія 10 гадоў павялічваецца і колькасць атрымалнікаў сацыяльных паслуг: рост за 10 гадоў склаў больш чым 40 %. Таму навацыі закона накіраваны на разві цё сістэмы сацыяльнага абслугоўвання ва ўмовах дэмаграфічнага старэння насельніцтва і росту попыту на сацыяльныя паслугі, — патлумачыла Кацярына Каляда.

СТАР. 2

Векапомнае

ЖЫВОЕ ЎВАСАБЛЕННЕ ПОДЗВІГУ

У Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны

Фармат мерапрыемства — спакойная, сяброўская размова за гарбатай. Вядома, ветэраны ўзгадавалі ваенныя падзеі, якія акурат супалі з іх маладосцю, дзяліліся гістарыяй свайго бавяго шляху. Аднак не толькі аб вайне вялася размовы. Дэпутацкаму корпусу было цікава даведацца, як удзельнікі Вялікай Айчыннай жывуць сёння, што іх хвалюе, якія, магчыма, ёсць пажаданні да прадстаўнікоў улады. Як падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГ'ЯЕНКА, толькі ў дыялогу розных пакаленняў, згуртаванасці і адзінстве — наша сіла.

Найперш, звяртаючыся да галоўных герояў мерапрыемства, Старшыня выказаў словы ўдзячнасці за іх баявы шлях і працоўны подзвіг у пасляваенны час. «У кожнага з вас, хто сёння тут прысутнічае, — свая біяграфія, але кожнага з вас сваім вогненным крылом апаліла вайна: 22 чэрвеня 1941 года раскалола жыццё ўсяго чалавецтва на «да» і «пасля», — канстатаваў Ігар Сергяенка. — На пачатак Вялікай Айчыннай вайны кожнаму з вас было ад 9 да 16 гадоў — яшчэ дзеці, падлеткі. Вы рана сталелі, вы сталелі разам са старэйшымі, якія пайшлі ваяваць на фронт, з тымі людзьмі, якія ваявалі з фашыстамі ў партызанскіх брыгадах, атрадах, і да завяршэння вайны многія з вас ужо сталі паўналетнімі. Да гэтага часу ў кожнага з вас за плячамі — баявы шлях. Гэта і бітвы з ворагам, і выкананне заданняў на падрыве варожых камунікацый. А што стаіць за тым, які працай была адноўлена народная гаспадарка, якой працай быў адноўлены горад Мінск? Тыя, хто прысутнічае тут, працуючы ў розных арганізацыях, бралі ўдзел у аднаўленні Мінска, узвядзенні многіх будынкаў. І вашы равеснікі, людзі таго пакалення ў тым ліку, аднаўлялі гэты гістарычны будынак — Дом урада».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў расказаў, што сучасныя дэпутаты свята шануюць памяць дэпутатаў Вярхоўнага Савета, якія сышлі на фронт і ваявалі ў партызанах. 94 чалавекі загінулі. Каля ўваходу ў Авальную залу ў іх гонар устаноўлены мемарыяльныя дошкі.

«Усё менш і менш становіцца ветэранаў, жывых сведак таго грознага часу, але здарава тое, што вы застаялі, пражылі такое цікавае, змястоўнае, складанае жыццё, — звярнуў увагу Ігар Сергяенка. — Вы для нас — жывое ўвасабленне подзвігу. І паверце, кожны жыхар нашай краіны так ці інакш звязаны з вайной — праз дзядоў, прадзедаў, бацькоў. Вайна закранула практычна кожную беларускую сям'ю».

Як падзяліўся **ветэран Вялікай Айчыннай вайны Фёдар ФЕШЧАНКА,** праз прысутнасць у Палаце прадстаўнікоў, удзельнікі тых падзей адчуваюць пераемнасць пакаленняў. «Вы шануеце памяць тых, каго ўжо няма, — гэта і ёсць бессмяротнасць нашага народа, — лічыць ён. — Я бачыў Мінск разбураным. А калі вярнуўся сюды пасля службы ў арміі, ішоў ужо не па разбураным горадзе, а па асфальтаваным праспекце Сталіна (цяпер Незалежнасці. — **«Зв.»**). Вось што значыць наш народ».

У памяці ветэрана — і яшчэ адзін эпізод. Фёдар Фешчанка — удзельнік Беларускай наступальнай аперацыі «Багратыён», у ходзе якой была вызвалена Беларусь. «Як мы ўспрымалі аперацыю «Багратыён»? — ставіць пытанне ветэран і адказвае на яго. — Быў стан упэўненасці ў нашай Перамозе. Мы ведалі, што гэта наступальная аперацыя. Перыяд абароны краіны, перыяд пастаяннага адчування, што ты не перамагаеш, а адбіваешся, ужо прайшоў. Я думаў, што фашысты будуць адступаць, а мы іх дагоняць. Дык не тое было! Упарта, жорстка яны супраціўляліся. Чаму? Адчувалі, што яны нараблі і ведалі, што адплата іх дагоніць. Так і атрымалася!»

Вераніка КАНЮТА.

Наша сіла — у праўдзе, адзінстве і патрыятызме

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дзмітрый Крутой расказаў, што прэзідэнты Беларусі і Расіі, падпісваючы асноўныя кірункі саюзнай інтэграцыі на трохгадовы перыяд, асабліва выдзелілі блок мерапрыемстваў, звязаны з 80-годдзем вызвалення Беларусі і маючым адбыцца ў наступным годзе святкаванне 80-годдзя Перамогі. «Наша задача ўсё гэта развіваць, памнажаць і абавязкова далучаць да гэтага моладзь, таму што ідэрж адпрацоўваецца ідэя частку грошай Саюзнага бюджэту патраціць навят не на нейкія галіновыя праекты, а на абмен школьнікамі, студэнтамі, па лініі валанцёрскіх арганізацый. Гэта дае больш сур'ёзны эфект да збліжэння нашых народаў менавіта на базе адзінага фундамента Вялікай Перамогі», — расказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. На яго словах, сёння назіраецца ўздым цікавасці да дэталяў асноўных бітваў і барацьбы партызан і падпольшчыкаў. Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што гэта выклікае павагу.

Напярэдадні галоўнага дзяржаўнага свята на ВДНГ у Маскве адкрылася часовая экспазіцыя «Вызваленне Беларусі». «Пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны ўсім здавалася, што нацызм канчаткова знішчаны. Аднак да нашага глыбокага шкадавання яго ідэі знайшлі новых пасляднікаў у самых адукаванных краінах свету. Гісторыя Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайнаў сёння не проста сфальсіфікавана калектыўным Захадам і яго сатэлітамі, а ўжо поўнасцю перапісана. Рабіласі гэта мэтанакіравана на працягу не аднаго дзесяцігоддзя. І такія ўнікальныя праекты, як прадстаўленая ў гэтай зале часовая экспазіцыя «Вызваленне Беларусі», павінны захаваць гістарычную праўду, абараніць нашу гісторыю, — сказаў Дзмітрый Крутой на адкрыцці выстаўкі. — Менавіта ў гэтым заключаецца наш вялікі абавязак перад вялікім пакаленнем пераможцаў, дзякуючы якім мы ўпэўнена глядзім у будучыню. Сіла беларусаў у праўдзе, адзінстве і патрыятызме. У нас ёсць родная краіна, якой мы ганарымся; ёсць армія, здольная даць жорсткі адпор любому агрэсару; і народ-пераможца, які памятае герояў і шануе свабоду».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што на працягу многіх стагоддзяў нашы продкі адважна змагаліся з заваёўнікамі, не пакараліся захопнікам і заклалі наш генетычны код. «Кіруючыся патрыятычнымі пачуццямі, у самыя цяжкія перыяды свайі гісторыі беларускі народ згуртоўваўся перад знешнімі пагрозамі, праяўляючы бяспрэцэдынавую мужнасць і гераізм у барацьбе за свабоду і незалежнасць Радзімы. Так было і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гісторыя не ведае больш маштабнага супраціўлення заваёўнікам, чым барацьба беларускага народа супраць германскіх прыгнятальнікаў. Насельніцтва Беларусі не прымірылася з агрэсарамі. Нават нягледзячы на жорсткасць акупацыйнага рэжыму, патрыятычны рух супраць захопнікаў пашыраўся, прымаў формы і выкарыстоўваў разнастайныя метады барацьбы», — адзначыў ён. Дзмітрый Крутой звярнуў увагу, што кожная вобласць Беларусі мае сваю гераічную гісторыю, і гэта знайшло адлюстраванне ў экспазіцыі. Гомельская зямля дала пачатак пераможнаму шэсцю Чырвонай Арміі і першай была вызвалена ад акупантаў. Віцебшчына, з яе лясныміі нетрамі і балотамі, праславілася партызанскім рухам. Мінскае антыфашысцкае падполле — найбуйнейшае з гарадскіх у Еўропе, стала сімвалам самаахвярнасці ў імя свабоды. За праяўленыя масавыя гераізм і мужнасць у барацьбе супраць агрэсараў Мінску было прысвоена ганаровае званне «Горад-герой». Брэсцкая крэпасць атрымала званне «Крэпасць-герой».

«Мы бачым, з якой павагай ставяцца ў Беларусі да подзвігу салдата Перамогі, з якімі добрымі пачуццямі ставяцца да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікоў тылу, партызанаў, якія яшчэ з намі. Мы разумеем, што час няўмольны, але гэты час не закрэслівае абавязацельствы казаць аб той вайне, уяраўца ў старонкі гісторыі», — сказаў на адкрыцці выстаўкі дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў. — Мы сёння з надзякай схіляем галовы перад памяццю загінулых. Вельмі важна, каб імёны людзей, у тым ліку прадстаўленыя ў рамках гэтай выстаўкі, мы памяталі».

Паводле БелТА.

Блізкая ўлада

Даручэнні дадзены, пытанні — на кантролі

Ігар СЕРГЯЕНКА правёў асабісты прыём грамадзян

Традыцыйна спектр пытанняў, якія людзі адрасавалі Старшыні Палаты прадстаўнікоў, быў шырокі. У прыватнасці, прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання ліквідатараў і інвалідаў чарнобыльскай катастрофы звярнуліся з просьбай разгледзець іх прапановы наконт аздараўлення, лячэння і рэабілітацыі. Прапанаванае ўключыць іх у законапраект «Аб ветэранах», над якім актыўна працуе дэпутацкі корпус.

Фота БелТА

Старшыня Беларускага рэспубліканскага грамадскага аб'яднання ліквідатараў і інвалідаў чарнобыльскай катастрофы Анатоль ГОЛЬДБЕРГ расказаў, што выконваў воінскі абавязак у зоне ЧАЭС з мая 1986 года да чэрвеня 1987 года. «Пасля заканчэння нашай службы ў Савецкім Саюзе быў прыняты закон аб сацыяльных гарантыях чарнобыльцам, які з часам адчуў пэўныя змяненні, і, на жаль, сёння з усіх ільгот, якія мы атрымлівалі, нічога практычна не засталося, — агучыў ён праблему. — Я больш чым год знаходзіўся ў Чарнобылі і карыстаюся толькі дзвюма ільготамі: стварадзеннай выплатай па бальнічным бюлетэні і сацыяльным вылікам пры наліўчыні падаходнага падатку. Больш ільгот няма, хоць у Савецкім Саюзе мы атрымлівалі дадатковыя дні да адпачынку, бясплатную пуцёўку ў санаторый, карысталіся бясплатным праездам у грамадскім транспарце. Больш за ўсё нас хвалюе тое, што тыя хлопцы, якія былі з намі ў Чарнобылі, па дасягненні 50-гадовага ўзросту павінны былі выйсці на пенсію. Сёння многім з іх далёка за 50, але яны яшчэ працуюць. Для таго каб ранеі выйсці на пенсію, ім трэба даказаць, што яны працавалі ў дзесяцікіламетровай зоне, хоць першы Закон сведчыў аб тым, што зонай адчужэння лічыцца 30-кіламетровая зона. Просім, каб да гэтага пытання аднесліся больш справядліва. Мы хочам, каб нашы просьбы ўнеслі ў абноўлены Закон «Аб ветэранах» і мы карысталіся заслужанымі ільготамі».

Як падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў, гэтае пытанне не адзнаў дня. «Яго трэба дэталізаваць шляхам абмеркавання за круглым сталом, — удакладніў Ігар Сергяенка. — Мы правядзём сустрэчу ў найбліжэйшы час, усё абмяркуем».

Як адзначыла ў размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Жанна ЧАРНЯЎСКАЯ**, у найбліжэйшай будучыні дэпутаты абмяркуюць прапановы ліквідатараў. «Мы збяром або круглы стол, або сумесную нараду з зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі і абмяркуем прапановы, якія былі ўнесены, — канкрэтызавала дэпутат. — У нас два асноўныя законы, якія рэгулююць пытанні сацыяльных гарантый і абароны насельніцтва, якое пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Думаю, што мы сумесна сфармулюем пэўныя прапановы і пагляджым, што можна зрабіць у цяперашніх эканамічных умовах».

Жыхар Гродна Яўген Сяргеевіч агучыў на прыёме грамадзян прапановы аб унясенні змяненняў у заканадаўства — у прыватнасці, у Банкаўскі і Грамадзянскі кодэксы, Закон «Аб адміністрацыйных працэдурах».

А мінчаніна Міхаіла Рыгоравіча хвалюе жыллёвае пытанне. Ён расказаў, што з 2019 года ў Мінску не здаюць дом па вуліцы Купрэвіча. «Здача дома планавалася ў снежні 2019 года, — заўважыў мінчанін. — Чатыры з паловай года прайшло — дом не здадзены. Дом дае незапланаваную ўсадку: на этапе праектавання дапушчаны памылкі».

Дольшчыкі ўжо звярталіся ў Мінгарвыканкам, Міністэрства па архітэктуры і будаўніцтве, Адміністрацыю Прэзідэнта. Зварот знаходзіцца на кантролі ў Мінгарвыканкаме. На асабісты кантроль гэтае пытанне ўзяў і Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

«Ігар Пятровіч паставіў задачу разабрацца і ўзяў праблему на кантроль з боку Палаты прадстаўнікоў, — адзначыў **член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Іван ГАРДЗЕЙЧЫК.** — У першую чаргу патрэбна праінфармаваць усіх дольшчыкаў аб прычынах пераносу тэрмінаў здачы. Чатыры з паловай гады — гэта тэрмін. Як дэпутат я таксама вазьму гэтае пытанне на кантроль і штомесяц буду сустракацца з грамадзянамі, супрацоўнікамі Мінгарвыканкама, якія за гэтае пытанне адказваюць. Будзем сумесна працаваць і рухаць гэтую праблему, не адкладваючы ее ні на заўтра, ні не паслязаўтра. Яе патрэбна вырашаць сёння».

Ірына Іванаўна і Дзмітрый Аляксандравіч з Мінска звярнуліся да спікера з зямельным пытаннем. Сужэнцы хацелі б узаконіць частку зямельнага ўчастка, якім карыстаюцца працяглы час. У жніўні 2023 года яны звярнуліся ў Шаршуноскі сельсавет з заявай аб афармленні зямельнага ўчастка, але сям'і было адмоўлена. У сакавіку яны былі на прыёме ў Мінаблвыканкаме і таксама атрымалі адмову. Адказным асобам даручана разабрацца.

Усе, хто прыйшоў на прыём грамадзян, атрымалі канкрэтныя адказы, у іх прысутнасці кампетэнтным асобам дадзены даручэнні. Людзі сыходзілі з Палаты прадстаўнікоў з надзеяй, што нарэшце іх праблемы вырашацца.

Вераніка КАНЮТА.

НОВЫЯ НАЗВЫ, ІНШЫ ЗМЕСТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сярод навацый закона — пашырэнне сістэмы сацыяльнага абслугоўвання. Цяпер у пералік сацыяльных устаноў уключаны дамы ці цэнтры часовага знаходжання для асоб без пэўнага месца жыхарства, а таксама рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў.

З 1 ліпеня новыя назвы атрымалі і дамы-інтэрнаты — цяпер гэта пансіянаты.

— Іх аблічча, функцыянал пашыраны, з улікам развіцця тэхналогій, патрэб грамадзян ён пастаянна мяняецца і актуалізуецца, таму сёння ў нашых стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання не толькі ажыццяўляецца догляд і забяспячэнецца пражыванне. Гэта мультыфункцыянальная ўстанова, дзе людзі, акрамя таго, праходзяць сацыяльную рэабілітацыю, атрымліваюць працоўныя навыкі, вырашаюць пытанні сацыялізацыі, арганізоўваецца вольны час, адкрываюцца аддзяленні дзённага знаходжання. Прадугледжана знаходжанне ў такіх установах ва ўмовах павышанай камфортнасці. Такое напаўненне дзейнасці прывяло да таго, што з 1 ліпеня дамы-інтэрнаты мяняюць назву на сацыяльныя пансіянаты, — расказала начальнік упраўлення.

Пры гэтым іх спецыялізацыя застаецца ранейшай. Гэта або профільныя (напрыклад, псіханеўралагічныя), або агульнага тыпу пансіянаты, а таксама дзіцячыя сацыяльныя пансіянаты.

— Напрыклад, раней установа мела назву «Целяханскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў», сёння гэта «Целяханскі сацыяльны пансіянат «Агінскі». «Якаўлевіцкі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў» змяніў назву на «Якаўлевіцкі сацыяльны пансіянат «Хатні ачаг». «Багушэўскі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця» цяпер называецца «Багушэўскі сацыяльны пансіянат «Прамяністы», — прывяла прыклады Кацярына Каляда.

Насуперак меркаванню, якое склалася, што цяпер у такія ўстановы трапіць будзе складаней, умовы ўсяленння, катэгорыі грамадзян, умовы аплаты для тых, хто пражывае платна, не змяніліся.

ДОЎГАТЭРМІНОВЫ ДОГЛЯД ДОМА

Наступная навацыя — ўкараненне сістэмы доўгачасовага догляду. Гэта комплекс мерапрыемстваў па суправаджэнні пажылога чалавека, які мае асаблівую патрэбу ў старонняй дапамозе. Будзе ажыццяўляцца дома ва ўзаемадзеянні з сацыяльнай і медыцынскай службамі.

— Мы плануем, што арганізацыя такога догляду дазволіць максімальна падоўжыць знаходжанне людзей, якія маюць патрэбу ў старонняй дапамозе, у звыклым спрыяльным асяроддзі, і для іх гэта будзе максімальна карысна і зручна, — падзялілася Кацярына Каляда.

Для каго прадугледжана гэта сістэма? Найперш для грамадзян, якія маюць асаблівую патрэбу ў старонняй дапамозе: пажылыя людзі ва ўзросце 65 гадоў і старэйшыя ды інваліды, якія маюць выяўленыя ці рэзка выяўленыя абмежаванні здольнасці самастойнага перамяшчэння, самаабслугоўвання, кантролю сваіх паводзін. Пры гэтым яны адначасова маюць патрэбу ў аказанні сацыяльных паслуг і медыцынскай дапамозе дома. Патрэба ў доўгатэрміновым доглядзе павінна пацвярджацца заключэннем урачэбна-кансультацыйнай камісіі, а каардынатарам усёй дзейнасці па арганізацыі доўгатэрміновага догляду будзе выступаць тэрытарыяльны цэнтр па месцы пражывання.

Яшчэ адна навацыя — дыстанцыйнае абслугоўванне. Цяпер аддалена можна атрымаць розныя паслугі: сацыяльна-рабілітацыйныя, уключаючы заняткі ў гуртках, клубах, псіхалагічную дапамогу — усё, што магчыма ажыццявіць з дапамогай сродкаў тэлекамунікацыі.

— У такой форме мы працавалі падчас пандэміі, убачылі яе запатрабаванасць, эфектыўнасць, таму цяпер у законе прадугледжана магчымасць атрымаць сацыяльныя паслугі ў дыстанцыйнай форме. Асабліва актуальна гэта для асоб, якія па нейкіх прычынах не могуць прысутнічаць у тэрытарыяльным цэнтры ці ў аддзяленні дзённага догляду, — патлумачыла начальнік упраўлення.

ПАДВОЗ ПАЖЫЛЫХ І ІНВАЛІДАЎ

Сярод новаўвядзенняў — транспартнае забеспячэнне сацыяльнага абслугоўвання. Яно ўнесена для паляпшэння даступнасці сацыяльных паслуг і якасці сацыяльнага абслугоўвання, прадугледжаны падвоз асобных атрымальнікаў сацыяльных паслуг. Магчымасць цэнтралізаванага падвозу будзе даступная для грамадзян, якія атрымліваюць сацыяльныя паслугі ў аддзяленнях дзённага знаходжання і тых, хто пражывае ў сацыяльных пансіянатах. Гэта магчыма на транспарце ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання, акрама таго, па рашэнні мясцовых выканаўчых органаў могуць быць арганізаваны іншыя формы падвозу. Напрыклад, на сацыяльным таксі.

Такая паслуга будзе магчымая для інвалідаў 1-2 груп, пенсіянераў, якія маюць выяўленыя ці рэзка выяўленыя абмежаванні здольнасці перамяшчэння, арыентацыі ці кантролю сваіх паводзін, а таксама для дзяцей-інвалідаў з 3 і 4 ступеняў страты здароўя. Такія перавозкі будуць ажыццяўляцца пры пэўных умовах: адсутнасць рэгулярных транспартных зносін, адсутнасць адаптаванага транспарту агульнага карыстання для грамадзян, якія маюць абмежаванні ў перамяшчэнні, немагчымасць па стане здароўя выкарыстоўваць пасажырскі транспарт, які маецца, а таксама несупадзенне раскладу пасажырскага транспарту і графіка атрымання сацыяльных паслуг.

Фота БелТА

НЕДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎСТАНОВЫ ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ ЛІЦЭНЗІЮ

Яшчэ адна навацыя — ліцэнзаванне ў галіне сацыяльнага абслугоўвання. Яму падлягаюць недзяржаўныя суб'екты гаспадарання, якія аказваюць сацыяльныя паслугі з пражыванем пажылым грамадзянам і інвалідам. Сёння зарэгістравана 34 такія суб'екты гаспадарання, 23 з іх ажыццяўляюць дзейнасць. Найбольшая колькасць гэтых устаноў размешчана ў Мінскай вобласці.

— У першую чаргу наша агульная задача — максімальнае забеспячэнне бясплатных умоў пражывання грамадзян у такіх установах і якаснае аказанне ім сацыяльных паслуг. Таму што сёння ў сацыяльных пансіянатах пражываюць грамадзяне, якія маюць патрэбу ў пастаяннай старонняй дапамозе і доглядзе. Гэта людзі з зусім нізкай ступенню рухальнай актыўнасці ці з сур'ёзнымі кагнітыўнымі парушэннямі. Таму наша агульная задача — аказаць якасныя паслугі і забяспечыць максімальна бяспечныя ўмовы пражывання, — патлумачыла Кацярына Каляда.

Уводзенне ліцэнзавання накіравана на захаванне патрабаванняў пажарнай бяспекі, санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў, а таксама патрабаванняў да якасці і зместу сацыяльных паслуг. Пры гэтым спецыяліст адзначыла, што цэнаўтварэнне ў прыватных сацыяльных установах не ўваходзіць у зону кантролю дзяржаўных органаў.

Нормы па ліцэнзаванні ўступаюць з 1 ліпеня, але да 1 кастрычніка магчыма ажыццяўляць дзейнасць без атрымання ліцэнзіі. Пасля дзейнасць без ліцэнзіі стане немагчымай. Ліцэнзаванне будзе ажыццяўляць мясцовы выканаўча-распарадчы орган. На сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны размешчана падрабязная інфармацыя для саіскальнікаў ліцэнзій, дзе тлумачыцца, якія дакументы ў якой паслядоўнасці і куды трэба падаць.

Ёсць змены і ў выплаце дапамог асобам, якія ажыццяўляюць догляд пажылых людзей, што дасягнулі 80-гадовага ўзросту, і інвалідаў. Яна па-ранейшаму складае 100 % БПМ, калі ажыццяўляецца догляд адзнаго чалавека, і 120 % БПМ — калі двух і болей.

Раней атрымальнікам такой дапамогі працаваць не дазвалялася. Цяпер жа блізкія сваякі, якія ажыццяўляюць такі догляд, могуць працаваць на палову стаўкі. Новаўвядзенне прынята з улікам распаўсюджанасці такіх формаў работы, як дыстанцыйная і змешаная.

Ёсць змяненні і ў заканадаўстве, якое датычыцца пахавання. Калі раней выконваць такія паслугі і атрымліваць на гэтыя мэты дзяржаўную дапамогу мелі права толькі фізічныя асобы, то цяпер яго атрымалі і сацыяльныя пансіянаты. Яны могуць пахаваць памерлага пастаяльца, калі ён не меў блізкіх, і прыцягнуць для такіх мэт спецыялізаваныя арганізацыі.

ПРАДЫКТАВАНА ЖЫЦЦЁМ

Як адзначыла **наменскік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама Вольга ВАСІЛЕЎСКАЯ**, навацыі закона чаканыя і былі ініцыіраваны выходзячы з практыкі.

— Частка з іх ужо мела сваё практычнае прымяненне і ўнесілася з практыкі работы сацыяльных устаноў, — падкрэсліла спецыяліст, дадаўшы, што ў Мінску сістэма сацыяльнага абслугоўвання прадстаўлена ў поўным фармаце. Акрамя дзевяці цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, якія аказваюць дапамогу па месцы жыхарства, функцыянуюць і сацыяльныя пансіянаты, Мінскі гарадскі цэнтр абслугоўвання сям'і і дзяцей, які аказвае дапамогу сем'ям у складанай жыццёвай сітуацыі. Працуе дом для ветэранаў і інвалідаў — сёння гэта дом суправаджальнага пражывання, дзе людзі з інваліднасцю, у першую чаргу маладыя, якія маюць патрэбу ў паслузе суправаджальнага пражывання, могуць пражываць самастойна пад наглядам работнікаў установы.

З 1 ліпеня ў сістэме сацыяльнага абслугоўвання і Дом начнога знаходжання для асоб без пэўнага месца жыхарства.

— Установа спецыфічная, але ўкараненне яе ў сістэму сацыяльнага абслугоўвання дае магчымасць і прымяніць мінімальныя стандарты, і нарміраваць і сістэматызаваць яе дзейнасць. Каля 40 чалавек за суткі ў сярэднім начуе ў гэтай установе. Яна працуе на сацыялізацыю па двух кірунках. Першы — сацыялізацыя праз працаўладкаванне для працаздольных асоб, пошук месца работы з магчымасцю пражываць у інтэрнаце. Другі — далейшае жыццеўладкаванне, калі гэта пенсіянер ці інвалід, аднаўленне яго сямейных сувязяў ці змяшчэнне ў сацыяльныя пансіянаты, — расказала Вольга Васілеўская.

Алена КРАВЕЦ.

ПРАЦАВАЎ ДА АПОШНЯГА ДНЯ...

На 76-м годзе жыцця раптоўна памёр Герой Беларусі, кіраўнік і грамадскі дзеяч, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі Васіль Рэвяка.

Нарадзіўся Васіль Афанасьевіч 15 ліпеня 1948 года ў вёсцы Рабец Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Пасля службы ў арміі і заканчэння Гродзенскага сельгасінстытута звязаў сваё жыццё з калгасам «Прагрэс» Гродзенскага раёна. У гэтым калектыве ён адпрацаваў звыш 40 гадоў і прайшоў шлях ад галоўнага заатэхніка да кіраўніка гаспадаркі. Дзякуючы выдатным лідарскім якасцям, стратэгічнаму мышленню, высокай працаздольнасці і пачуццю перспектывы Васіль Рэвяка стварыў высокаэфектыўную гаспадарку з апорай на пераемнасць кадраў і моладзь. Як кіраўнік аднаго з самых паспяховых сельгаспрадпрыемстваў краіны, сур'ёзнае значэнне ён надаваў рэалізацыі дзяржаўных праграм на сяле, што садзейнічала павышэнню якасці жыцця людзей. Клапаціўся аб сацыяльных пытаннях населеных пунктаў, бяспечных і камфортных умовах працы на вытворчасці, замацаванні маладых спецыялістаў.

Васіль Рэвяка валодаў невычэрпнай энергіяй, пачуццём высокай адказнасці, уменнем увасабляць у жыццё самыя смелыя ідэі, праекты і рашэнні, чым завяваў заслужаны аўтарытэт у грамадстве. Рэалізаваў сябе як народны выбраннік у якасці дэпутата Савета дэпутатаў усіх узроўняў, у тым ліку Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

За значны асабісты ўклад у развіццё сельгасвытворчасці, умелае кіраўніцтва і дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў Васіль Рэвяка ўзнагароджаны ордэнам «Знак пашаны» і медалём «За працоўныя заслугі», удастоены ганаровага звання «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі».

У сакавіку 2006 года за выключныя заслугі ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны Васілю Афанасьевічу прысвоена званне «Герой Беларусі». Да апошніх дзён ён заставаўся на пасадзе старшыні праўлення СВК «Прагрэс Верцяшікі».

«Васіль Афанасьевіч — яскравы прыклад добрасумленнай працы і аддання служэння Радзіме, — гаворыцца ў спачуванні, якое Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў родным і блізкім Васіля Рэвякі. — Яго шматгадовая дзейнасць была неразрыўна звязана з развіццём і поспехамі айчыннага аграрна-прамысловага комплексу, забеспячэннем харчовай бяспекі краіны, стварэннем умоў для жыцця людзей на сяле. Ён заўсёды вызначаўся ініцыятыўнасцю, любоўю да роднай зямлі, павагай да чалавека працы, высокімі маральнымі прынцыпамі і шчырым імкненнем умацоўваць аўтарытэт беларускай дзяржавы».

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Васіля Афанасьевіча РЭВЯКІ, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага і пятага склікання, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, кандыдата сельскагаспадарчых навук, старшыні праўлення сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Прагрэс-Верцяшікі», і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Смуткуем і падзяляем горыч гэтай незаменнай страты.

Светлая памяць пра Васіля Афанасьевіча назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Повязь пакаленняў

Ёсць такія моманты, якія і хацеў бы забыць, не забудзеш

Самая важная і мудрая экскурсія ў Палац Незалежнасці

Палац Незалежнасці бачыў шмат розных людзей — прэзідэнтаў, міністраў, кіраўнікоў прадпрыемстваў, журналістаў, спартсменаў, акцёраў. Напярэдадні галоўнага дзяржаўнага свята — Дня Незалежнасці — знакаміты будынак наведалі людзі, дзякуючы якім у нашай краіне ёсць такія палацы, у якіх могуць збірацца прадстаўнікі розных сфер. Прэзідэнт неаднаразова падкрэсліваў, што ўсе здабыткі і дасягненні сучаснай Беларусі магчымыя дзякуючы «гігантам», на плячах якіх мы стаім. Тыя самыя «гіганты» — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, жыхары блакаднага Ленінграда, працаўнікі тылу, былыя непаўналетнія вязні, ветэраны працы, якія нарадзіліся ў ваенныя гады, — напярэдадні 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад фашызму ўпэўніліся, як сучаснае пакаленне выкарыстоўвае іх досвед і захоўвае незалежнасць, якую яны здабылі. А пакольскі Палац Незалежнасці, па сутнасці, сімвал нашай незалежнасці, сабраў у сабе ўсе найлепшыя здабыткі нашай краіны, праверка атрымалася грунтоўнай і цікавай. Прычым цікавай, як для гасцей, так і для тых, хто па службовых абавязках наведвае Палац Незалежнасці амаль кожны дзень.

Звычайна падчас экскурсій у цэнтры ўвагі — інтэр'еры Палаца Незалежнасці і падзеі, якія тут адбываюцца. Але гэтым разам у цэнтры ўвагі былі госці, бо ў кожнага з іх за плячыма гісторыі, якія трэба слухаць і ўважліва запамінаць. Гэтым разам Палац Незалежнасці наведалі 53 чалавекі, з іх 5 удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, 13 жыхароў блакаднага Ленінграда, 1 чалавек тылу, 17 былых вязняў фашызму, 16 ветэранаў працы, якія нарадзіліся ў ваенныя гады. І за плячыма ў кожнага — свая гісторыя, свой боль і свая вайна, якая іх не зламала.

У сценах Палаца Незалежнасці слоў на вецер ніхто не кідае. Тут часта робяцца гучныя заявы, інфармацыя, якую перадаюць журналісты з мерапрыемстваў, што тут праходзяць, уплывае на жыццё краіны. Але ў гэтыя перадсвяточныя дні самыя гучныя — гісторыі гасцей, якія паспявалі ўсё: захапляцца, фатаграфавацца, уважліва слухаць і расказваць пра свой нялёгкі лёс.

«Бегла, падала, плакала, але мэта была адна — хутчэй дабегчы»

Ефрасінні Базылевай летам 1941 года было 13 гадоў. Сям'я з дзевяці чалавек жыла ў вёсцы Цішоўка за дзвюма кіламетрамі ад Магілёва: «Калі даведаліся, што немцы без абвяшчэння вайны напалі на Савецкі Саюз і Радзіма-маці ў небяспецы, увесь народ падняўся, ад малога да вялікага, на барацьбу з ворагам. І наша сям'я таксама. Хутка ў Магілёве арганізавалася падполле, а недалёка ад нашай Цішоўкі — партызанскі атрад. Мая старэйшая сястра Верачка працавала на чыгуначнай станцыі № 1 горада Магілёва ў сталовай. І яна супрацоўнічала з падпольшчыкамі. Дзве старэйшыя сястры таксама дапамагалі падпольшчыкам. Браты ж пайшлі ў партызаны, тата ім дапамагаў. А мне ўсяго 13 гадоў, я самая малодшая і ўвесь час прасіла ў братоў сабе якое-небудзь заданне. Нарэшце я яго атрымала — трэба было перадаць звесткі ад сястры-падпольшчыцы партызанам. Яна, працуючы на чыгунцы, даведалася, калі будзе ісці нямецкі эшалон, і партызаны перад ім падкладвалі ўзрыўчатку. Так з 1941 да 1943 года я некалькі разоў на тыдзень у любое надвор'е хадзіла па пяць кіламетраў па даныя. Увосень мне іх ушывалі ў падклад паліто, узімку — пад вусцілку валёнкаў. І дзякуючы гэтым звесткам партызаны маглі граміць ворагаў. У 1943 годзе нехта расказаў фашыстам, што наша сям'я партызанская. І маю старэйшую сястру Веру акупанты забралі ў турму. Вельмі доўга катавалі, але яна не вымавіла ніводнага слова. Нічога не сказала. І яе расстралялі. Гэта было вельмі складана перажыць, але жаданне знішчыць фашыстаў стала яшчэ мацнейшым. Я працягвала хадзіць у Магілёў на звесткі ад падпольшчыкаў, цяпер іх перадавала мая сястра Марыя, якая працавала на шаўковай фабрыцы. Аднойчы я заявіла, што толькі звесткі нашу і нічога такога не раблю, папрасіла і сама пакласці міну на чыгунку. Партызаны пагадзіліся. Мы прыйшлі на чыгунку, падрыхтавалі месца, я сама заклала ўзрыўчатку. І калі цягнік з фашыстамі ўзляцеў у паветра, я адчула, што таксама дапамагла знішчыць фашыстаў. За намі сачылі, але бацькі працягвалі дапамагаць партызанам. Тата збіраў у нашым хляве для іх зброю. Аднойчы дома засталіся толькі я і мама, і немцы акружылі нашу хату. Менавіта ў той вечар, калі партызаны павінны былі прыйсці па зброю. Мы спалохаліся, што спаляць усю вёску. Але ў мамы ўзнікла думка — я ўзяла маленькі бітончык і папрасілася ў немцаў сходзіць па малако да суседкі. Немцы мяне выпусцілі. Я пакінула бітончык у суседкі. А сама агародамі, полем падбегла да партызанаў. А зіма ж, гурбы снегу вялізныя, поле непратаптанае. Бегла, падала, плакала, але мэта была адна — хутчэй дабегчы, каб не размінуцца з партызанамі. Не ведаю, адкуль у мяне столькі сілы ўзялося. І мы з імі сустрэліся, мне ўдалося іх папярэдзіць. Я вярнулася да суседкі, узяла малака, і немцы пусцілі мяне дадому. Дом быў акружаны да самай раніцы. Але жыхаркі вёскі яны не кранулі. Вось такім было маё дзяцінства... Пасля ўдзельнічала ва ўзнаўленні Магілёва, вучылася там у інстытуце. Выйшла замуж і пераехала ў Мінск, 30 гадоў працавала настаўнікам. А калі выйшла на пенсію, мяне запрасілі ў Савет ветэранаў. І да гэтага часу я працую. Мы сустракаемся са школьнікамі, праводзім урокі мужнасці і розныя мерапрыемствы. Я лічу, што мая сям'я і я выканалі свой абавязак перад народам».

Фота Belta.

Валерый НЕЙМАН правёў у блакадным Ленінградзе ўсе 900 страшных дзён.

«Ноччу ўставаў і правяраў, ці на месцы сухары»

Час ідзе, і непасрэдных удзельнікаў тых жудасных падзей, на жаль, застаецца ўсё менш. Але яшчэ ёсць людзі, якія ў сілу ўзросту не ўдзельнічалі ў барацьбе з ворагам. Сёння задача «дзяцей вайны» — данесці «дзецям сучаснасці», чаму трэба зрабіць усё і нават больш, каб больш не паўтарыць таго жаху. Данесці не праз развагі і натацыі, а проста расказаўшы сваю гісторыю.

Валерый Нейман бачыў тое, ад чаго і праз 80 гадоў становіцца жудасна. Можна прачытаць сотні кніг і паглядзець тысячы фільмаў, але самае моцнае ўражанне ад блакады Ленінграда пакідаюць расказы сведкаў. Валерый Нейман правёў у Ленінградзе ўсе 900 дзён блакады: «Блакада Ленінграда ў двух словах — холад і голад. У кожнай кватэры стаялі буржуйкі, якія жэрлі вельмі шмат паліва, а ўзяць яго не было дзе. Бацька скончыў ленінградскі медыцынскі інстытут, у яго была вялізная бібліятэка, якая нас сагрэла. Мае бацькі былі ваеннымі медыкамі. Бацька заявіў на Ленінградскім фронце, быў старшым доктарам танкавага палка. Мама працавала ў Ленінградзе аперацыйнай сястрой у шпіталі. Тата не ведаў, як на самай справе і нас усё дрэнна. Усе лісты, у якіх мама апісвала наша жудаснае становішча, да яго не даходзілі. У 1943 годзе татава дывізія трапіла ў акружэнне. Тата павёз у Ленінградскі шпіталь параненага начальніка штаба. Зразумела, калі выдалася вольная хвілінка, ён паляцеў да нас. А наш дом падчас бамбёжкі знішчылі, і нам далі кватэру ў іншым доме. Але бацька ўсё ж такі нас знайшоў. У яго як у афіцэра была пайка з ежай. І калі ён даставаў кансервы, слоік тушонкі, амерыканскі шакалад, сухары... Я гэтыя сухары хаваў пад падушку і ноччу ўставаў і глядзеў, ці на месцы яны. А там яшчэ былі макароны — шэрыя, трубчастыя. Мама іх прыгатавала і адварнулася. Я ж галодны, я іх і з'еў. Бацька, франтавік, хірург, які бачыў столькі смерцяў, глядзячы на мяне, заплакаў...»

Мелянія Коржух — чатырохгадовая жыхарка палескай вёскі, відаць, была «вельмі страшным ворагам» для нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтаксама як яшчэ сотні дзяцей і жанчын, якіх прымусова вывезлі ў Германію. «У 1943 годзе жыхароў нашай вёскі і суседніх загналі ў вагоны для скаціны і павезлі ў Германію. На дарозе нас кармілі адходамі, таму многія да месца прызначэння не даязджалі. Мяне з сёстрамі і іншымі дзецьмі прывезлі ў канцлагер у горадзе Зальцведэль. Нас вырывалі з рук маці і кідалі за калючы дрот. А бацькоў загналі ў іншы канцлагер. Мы жылі ў бараку з трох'ярусными нарамі, у мяне на ўсё жыццё застаўся шнар на губе ад падзення з іх. Нам давалі пілюлі — белыя і чорныя. І потым глядзелі на наш стан. Тых, хто быў млявы, дрэнна сябе адчуваў, ставілі спіна да спіны і адной куляй расстрэльвалі. Гэта называлася ў іх «бутэрбродзікі». Потым нас чамусьці загналі ў падвал. Вельмі гучна пачалі выць сірэны. Было вельмі страшна, гэта я добра памятаю. Аказваецца, гэта была Перамога! Дзень Перамогі ў Германіі я сустрэла ў склепе. Нас вызвалялі амерыканскія салдаты, на ламаная рускай мове яны спрабавалі растлумачыць, што мы вольныя, але ад страху мы нічога не разумелі. Нас павезлі ў Беларусь, дзе я сустрэлася са сваёй сям'ёй. Дзякуй богу, усе засталіся жывыя. А потым я пераехала ў Мінск, дзе будавала нармальнае мірнае жыццё, якое павінна быць у кожнага чалавека. Але балючыя ўспаміны ніколі мяне не пакідалі. Ёсць такія моманты, якія і хацеў бы забыць, не забудзешся».

Не забываць успаміны Ефрасінні Базылевай, Валерыя Неймана, Меланні Коржух і яшчэ тысяч сведкаў жахаў, якія адбываліся 80 гадоў таму, абавязаны кожны, хто іх пачуў ці прачытаў. Усе любяць запамінаць добрыя светлыя падзеі. Але ў памяці варта зафіксаваць і такі боль, страх, адчай, да якіх дадаецца і вялікі гераізм. Як мінімум для таго, каб больш цаніць светлыя і добрыя моманты.

Валерыя СЦЯЦКО.

Актуальна

Аб'ёмныя рэчы лепш пакінуць дома

Сілавыя ведамствы арганізуюць поўную бяспеку грамадзян падчас мерапрыемстваў да Дня Незалежнасці

У сувязі з маючымі адбыцца святочнымі мерапрыемствамі Міністэрствам унутраных спраў у межах кампетэнцыі вядзецца необходная падрыхтоўчая работа, а таксама рэалізуюцца комплекс прафілактычных мер, расказаў намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Сяргей МІРОНЧЫК.

Ён, у прыватнасці, адзначыў, што рашэннем міністра ўнутраных спраў Беларусі асабовы склад ведамства пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы. Будзе арганізавана работа аператыўна-сітуацыйных штабоў. Супрацоўнікі будуць несці службу як у форменным абмундзіраванні, так і ў цывільным адзенні.

«Абсалютна ўсе месцы правядзення масавых мерапрыемстваў будуць узяты пад наш кантроль. У тым ліку з выкарыстаннем рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі. Таксама будуць узмоцнены меры бяспекі на аб'ектах чыгуначнага і павет-ранага транспарту. У мэтах забеспячэння бяспекі ў святочных лакацыях, у тым ліку пры правядзенні парада 3 ліпеня ў горадзе Мінску, арганізавана работа кантрольна-прапускных пунктаў (КПП) з асабістым наглядам грамадзян.

Для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, цяжарных, а таксама грамадзян, якія маюць малалетніх дзяцей, будзе арганізавана работа асобных пунктаў пропуску па дадатковых «дарожках», — распавёў Сяргей Мірончык.

Таксама МУС рэкамендуе грамадзянам не браць з сабой буйнагабарытную ручную паклажу. У ахоўную зону не будуць дапушчаны асобы ў стане алкагольнага ап'янення з забароненымі прадметамі, у тым ліку з веласіпедамі, электрасамакатамі, а таксама хатнімі жывёламі. Для зручнасці насельніцтва прадугледжана работа камер захоўвання, якія будуць знаходзіцца паблізу кантрольна-прапускных пунктаў. Перад кожным КПП усталююць інфармацыйны стэнд з указаннем рэчаў, якія праносіць нельга.

«Паблізу месцаў правядзення мерапрыемстваў будзе абмежаваны рух транспартных сродкаў. Зменены маршруты руху грамадскага транспарту. Пажадана гэтыя нюансы прадугледзець загадзя.

З улікам ажыццяўлення надзвычайных мерапрыемстваў і абмежавання руху транспарту Міністэрства ўнутраных спраў рэкамендуе плануваць свае маршруты і загадзя прыбываць да месцаў правядзення мерапрыемстваў. Мы папросім з разуменнем паставіцца да прыманых мер бяспекі. Асабовы склад сілавых ведамстваў накіраваны на падтрымане спакойнай, свядомай актыўнасці і ў любой сітуацыі гатовы прыйсці на дапамогу людзям», — падсумаваў спікер.

Як адзначыў **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення аварыйна-ратавальных службаў і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Ігар ГУЛЯКЕВІЧ**, у мэтах падрыхтоўкі і забеспячэння бяспечнага правядзення святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Незалежнасці, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях загадзя быў праведзены комплекс мер, накіраваны на прафілактыку ўзнікнення надзвычайных сітуацый і аператыўнае рэагаванне на іх.

«Органамі і падраздзяленнямі па надзвычайных сітуацыях распрацаваны адпаведныя планы арганізацыі нясення службы, у тым ліку ў месцах масавых гулянняў. У перыяд святочных мерапрыемстваў падраздзяленні МНС будуць несці службу ва ўзмоцненым рэжыме", — распавёў Ігар Гулякевіч.

Паводле яго слоў, усяго на краіне на дзяжурстве будзе задзейнічана 3500 ратавальнікаў і 1300 адзінак тэхнікі. "У месцах правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Незалежнасці, запланаваны дзяжурствы работнікаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях. Усяго 3 ліпеня па краіне плануецца задзейнічаць кандрэтна ў месцах правядзення святочных мерапрыемстваў больш за 150 адзінак тэхнікі МНС і больш за 800 работнікаў нашых падраздзяленняў. Пры правядзенні ваеннага парада таксама плануецца ўдзел нашых работнікаў для забеспячэння пажарнай бяспекі — гэта 115 работнікаў і 19 адзінак пажарнай аварыйна-ратавальнай тэхнікі», — адзначыў намеснік начальніка ўпраўлення.

Хуткая медыцынская дапамога таксама пяройдзе ў рэжым павышанай гатоўнасці. **Начальнік аддзела арганізацыі медыцынскай абароны пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Аляксандр ПАНЦЮХОЎ** адзначыў, што бальніцы ўжо падрыхтаваліся да магчымага прыёму пацыентаў на выпадак масавай шпіталізацыі. Створаны рэзерв неабходных лекавых сродкаў і вырабаў медыцынскага прызначэння, запасы крыві і ея кампанентаў, падрыхтаваны рэзервовыя ложкі.

«На ваенны парад 3 ліпеня ад Міністэрства аховы здароўя вылучаецца 32 брыгады хуткай медыцынскай дапамогі, з іх восем спешаных, якія будуць працаваць на трыбунах або ў пэўных сектарах, і дзевяць брыгад хуткай медыцынскай дапамогі ў рэзерве. Для суправаджэння ветэранаў на кожную групу вылучаецца медыцынскі работнік, які будзе разам з імі ў працэсе перавозкі і на трыбунах», — распавёў Аляксандр Панцюхоў.

Сяргей КУРКАЧ.

Напярэдадні

Яны былі першымі

Выстаўка, прысвечаная дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР першага склікання — удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, адкрылася ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь.

Праект «Яны былі першымі» стаў вынікам сумеснай даследчай працы супрацоўнікаў музеяў, архіваў і Прэзідэнцкай бібліятэкі, у фондах якой захоўваюцца ўнікальныя друкаваныя і перыядычныя выданні даваенных і ваенных гадоў.

— Выстаўка прысвечана лёсам дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР першага склікання, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны гераічна змагаліся на франтах, былі актыўнымі ўдзельнікамі, а ў шэрагу выпадкаў і арганізатарамі падпольнага і партызанскага руху, працавалі ў тыле, а ў пасляваенны перыяд аднаўлялі нашу краіну, — адзначыў **дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі Сяргей КВАЧАН.**

КОЖНЫ ПЯТЫ

Вярхоўны Савет БССР з 1938 да 1990 года быў вышэйшым органам дзяржаўнай улады краіны. Ён стаў правапераемнікам Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР. У сваю чаргу ў найноўшай гісторыі Беларусі праваперамеснікам гэтага вышэйшага органа дзяржаўнай улады стаў парламент. Першым старшынёй Вярхоўнага Савета БССР у 1938 годзе быў Надзея Грэкава, савецкі дзяржаўны дзеяч і з 1947 года — міністр харчовай прамысловасці БССР.

— Першыя выбары ў Вярхоўны Савет БССР адбыліся 26 чэрвеня 1938 года, — распавёў на захадзе — 14—15 ціпла, удзень ад плюс 20 градусаў на захадзе да 31 ціпла на паўднёвым усходзе краіны.

У свята ўмовы надвор'я ў асноўным будуць вызначаць халодныя няўстойлівыя паветраныя масы, у паўднёва-ўсходніх раёнах краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзелу. Чакаецца воблачнае з прасяненнямі надвор'е. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі па краіне будзе згушчацца слабы туман. Вецер пераменных напрамкаў умераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы 11—18 градусаў, максімальная днём — 18—25 градусаў.

Сяргей Квачан. — Былі абраныя 273 дэпутаты. У сувязі з ўзяднаннем зямель Заходняй Беларусі і БССР былі праведзены другія выбары, выніх якіх — яшчэ 202 народныя выбраннікі. Такім чынам, менавіта Вярхоўны Савет БССР першага склікання стаў самым шматлікім па складзе.

З 1938 да 1941 года ў Вярхоўным Савеце БССР працавалі 475 дэпутатаў — яны прадстаўлялі ўсе рэгіёны рэспублікі. З пачаткам вайны многія з іх адправіліся на фронт, астатнія ўдзельнічалі ў партызанскім руху або працавалі ў тыле, набліжаючы вызваленне роднай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За гады вайны Вярхоўны Савет недалічыўся 94 чалавек: у ліку тых, хто загінуў або знік без вестак, — кожны пяты дэпутат першага склікання.

— Дзякуючы пошукавай рабоце, якая была ініцыявана Палатай прадстаўнікоў, сумесна з музеямі і архівамі мы ўстанавілі, што ў гады вайны на франтах, у партызанскіх атрадах загінулі 52 дэпутаты першага склікання і 42 дэпутаты прапалі без вестак, — сказаў Сяргей Квачан. — Сёння імёны 94 дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР першага склікання ўвекавечаны каля ўвахода ў Авальную залу Дома ўрада Беларусі.

У даваенны час малы Емяльян і яго сястра Фрося рана засталіся без маці, іх выхоўвалі бацька і мачаха (жанчына, па словах Емяльяна Сцяпанавіча, неблагая). Ці то характар такі быў добры, ці, па іншай версіі, моцна адбіваўся ўплыў свёкра, якога яна вельмі паважала, а часам і пабойвалася — ён вызначаўся не толькі моцным здароўем, але і сталёвай воляй. Як бы там ні было, дзяцей выгадавалі, паставілі на ногі, і неўзабаве старэйшы Емяльян адправіўся ў дарослы шлях, першым крокам на якім стала служба ў Чырвонай Арміі. Першапачаткова ён быў прызначаны на падводны флот. Але ў «вучэбцы» ў маладога марака знайшлі захворванне, якое выключала службу на падлодцы. Прыйшлося вяртацца ў родныя мясціны, і ўжо адтуль яго па камсамольскай лініі направілі вучыцца ў Мінск, у Камуністычны інстытут журналістыкі. А праз паўтара года пачалася вайна...

Заўважу, што ў размовах з намі, дзецьмі, бацька заўжды, як, дарэчы, і многія франтавікі, стараўся ваеннаму тэму абыходзіць — вельмі многа болю, вельмі шмат пакут і страт. Але ж калі ўжо надта назаляслі, то пачынаў расказваць. Прычым аповеды яго былі больш пра жыццё-быццё на Зыславе маладых, крыху хуліганістых і гатовых улезці ва ўсякае ліха хлопцаў. А пра жорсткасць вайны, бесчалавечнасць ворага, страшэнныя выпрабаванні і сапраўдны гераізм бацькі расказвалі яго таварышы па падполлі. І мама.

Менавіта яны расказалі, што ў акупаваным Мінску Емяльян Шурпач быў звязаны з патрыётамі яўрэйскага гета. Ён не толькі ўдзельнічаў у ліквідацыі здраднікаў, але і выводзіў яўрэяў з горада, выратаваўшы такім чынам не адзін дзясятак жыццяў. Здарылася ў яго бягрэфіі і цяжкае раненне: пазней, калі ўжо былі ў партызанах. Падчас блакады гітлераўцамі партызанскай зоны бацьку дастала варожая міна, яе асколак добра шкодзіў яго сэрцу. Пашанцавала — ад смерці і інваліднасці выратаваў напакаваны «з верхам» заплечнік. Але без медыкаментаў, у блакадзе, у балотах і антысанітарыі выздараўленне ішло цяжка: рана дрэнна загойвалася, і ўсё магло скончыцца бядой. Але па волі выпадку, а я думаю — па волі лёсу, знайшоўся ўрач, яўрэй, які, пераадолеўшы страх і рызыку, узяўся паставіць раненага на ногі. У яго ўсё атрымалася.

З цягам часу фашысты ўсё тужэй зацягвалі кальцо вакол Мінскага падполля, усё больш падпольшчыкаў траплялі ў гестапаўскія засценкі. Было прынята рашэнне «Звязду» і ўсіх, хто ўдзельнічаў у выхадзе яе першых чатырох нумароў (пяты быў падрыхтаваны, але яго не змаглі надрукаваць) тэрмінова перавесці ў партызанскую зону на Любаншчыне. І там з 27 студзеня 1943 года да ліпеня 1944-га было падрыхтавана і выйшла 105 нумароў газеты-падпольшчыцы.

Як расказваў бацька, да звяздоўцаў на Зыслаў часта наведваліся высокія госці: тагачасны сакратар падпольнага ЦК ЛКСМБ Кірыл МАЗУРАЎ, камандзір Мінскага партызанскага злучэння Васіль КАЗЛОЎ і іншыя. Аб адным з такіх наведванняў ён успамінаў: «У разгары — друк газеты, мы ўсе ў поце і рабоце, нікога-нічога не бачым і не чуем. Стаю спінай да ўваходу, і тут голас — «Што гэта за дысцыпліна, што за кашалтая супрацоўнікі?» Я зразумеў, што заўвага ў мой адрас, бо з прысутных толькі я быў уладальнікам раскошнай шавялюры. Не падымаючы галавы, я паслаў крытыка куды далей. Толькі потым мне сказалі, хто гэта быў. А Мазураў не паскардзіўся, махнуў рукой: «Не чапайце, няхай працуюць далей». Ды й пайшоў». Прайшлі гады, валасоў на галаве Емяльяна Шурпача амаль не засталося, але той выпадак ён не проста захаваў у памяці, але і ў псеўданіме — Кашлаты, якім на працягу ўсёй журналісцкай работы падпісваў свае самыя вострыя сатырычныя артыкулы і фельетоны.

Што яшчэ мяне заўсёды здзіўляла ў бацьку і яго сябрах, дык тое, што вайна не зрабіла іх жорсткімі. Не было ў іх злобы, нянавісці ці жывёльнай прагі помсты. Аднаваскоўка данесла паліцаям аб сувязі з партызанамі майго прадзеда, якому на той час споўнілося 101 год. Пасля вызвалення, здавалася б, што настаў той самы час, калі можна адпомсціць за здраду, за смерць блізкага чалавека. Але ж бацька дараваў, пашкадаваў шматдзетную маці...

Яны заўсёды заставаліся сумленнымі людзьмі, партызанскае брацтва, узаемавыручка, падтрымка адзін аднаго — усё гэта засталося ў іх на доўгія гады. Месцам штогадовай сустрэчы звяздоўцаў стаў Зыслаў. Я памятаю, як мы ўсёй сям'ёй збіралі тату на гэтыя сустрэчы: касцюм з-пад іголачкі, найлепшая кашуля і абавязкова новы капялюш. Вяртаўся ён з вострава адухоўлены і быццам памаладзеўшы. Адна год з году бляск з вачэй знікаў усё больш і больш, і аднойчы, вярнуўшыся адтуль, ён сеў на стул і, ледзь не плачучы, сказаў: «Як жа цяжка! Кожная новая сустрэча ўсё больш нагадвае памінкі».

Шчыра кажучы, расказваць, якім быў мой бацька, вельмі нялроста. Успаміналі шмат, адно чапляюць за другое і так да бясконцасці. Ды і не быў звыклы Емяльян Шурпач да ўвагі да сваёй асобы. Не любіў гэтага. Таму — літаральна ў некаторы радкоў, так бы мовіць, штрыхі да партрэта. Першае, што заўважалі ўсе, — ён сапраўды быў таленавітым. Ва ўсім: адпольклава выдатна пісаў артыкулы, прыгожа іграў на скрыпцы, гітары, мандаліне, мог лёгка скласці зруб хаты і накрыць дах, а потым элегантна абыграць каго ў шахматы. А яшчэ па ўсёй акрузе ён славіўся знатным печніком. Апошнія печ і грубку ён склаў у нашай дараганаўскай хаце, калі яму было ўжо 65 гадоў. І склаў так, што паслужаць яны верай і праўдай не адзін і не два дзясяткі гадоў. Але самы галоўны яго талент — дапамагаць людзям, і гэта ў яго атрымлівалася лепш за ўсё.

«Звязда» — не ў пераносным, а ў самым прамым сэнсе гэтага слова — стала для яго пуцяводнай зоркай. Любоўю на ўсё жыццё. Здараліся розныя абставіны, і яму прыходзілася сыходзіць з выдання. Але ніколі назаўсёды. Газета стала яго першым працоўным месцам. І апошнім. Спачатку быў дойгі-дойгі бальнічны, а потым — апошняя сустрэча са звяздоўцамі ў родным Дараганаве, куды яны прыехалі, каб развітацца і правесці ў апошні шлях свайго Сцяпанавіча. Партызана, журналіста, бацьку, Чалавека...

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота з сямейнага архіва і архіва газеты «Звязда».

З ненадрукаванага

Асядланы фашыст

У сярэдзіне зімы сорак чацвёртага фашысты распачалі вялікую карную экспедыцыю супраць нашага злучэння. Фронт тады падышоў ўшчыльную да партызанскага краю. Вось акупанты і наважыліся выцесніць партызан са свайго тылу. Не ў прыклад былым карным паходам фашысты на гэты раз не спалохаліся балота на ўскраі Любаншчыны, якое мясцовыя жыхары празвалі «чорным».

Нялёгка давалася ворагу наступленне на партызанскі край. Кожны сухі грудок яны вымушаны былі браць з боем. Але і партызанам таксама даставалася. Мокрыя, галодныя, без патронаў, яны перайшлі на так званую манеўраную вайну. Гэта значыць, малыя групы затойліваліся ў лазняку, прапускалі варожых салдат, а потым нападалі з тылу. Такім чынам акупанты не мелі ні хвіліны супакою.

Здарылася гэта на пачатку мая. Пачало прыграваць сонейка. На бярозах, лазняку з'явіліся першыя лісточкі. Наша невялікая група атрымала заданне: прабрацца на груд Блудны і там адкапаць запасы друкарскай фарбы для «Звязды».

Прабіраліся вельмі асцярожна. Вось і Блудны блізка. А паміж грудком, дзе мы затаіліся, і Блудным — прагаліна. Трэба разведаць, што там робіцца.

— Я ўзлезу на бярозу і пагляджу, — прапанаваў Уладзік Мазуркевіч, сарыты, рухавы хлапец.

Праз хвілін колькі Уладзік ужо сядзеў высока на бярозе. Мы ўважліва за ім сачылі.

Пачулася чаўканне багіны. На палянку, дзе расла бяроза, выйшлі два варожыя салдаты. Ім, відаць, спадабалася гэтае месца, бо адразу паскідалі аўтаматы, пачалі разувацца. Скінулі гумавыя боты, распранулі мундзіры. Сядзяць, грэюцца на сонцы, шкрабуць пакусаныя вашыма падпахі.

Мы ўмлелі. Самі маглі і знікнуць, а вось Уладзік як? Крыкнеш — пачуюць варагі. Нападаць на іх — рызыкоўна: можа, гэта толькі дазор, а асноўныя сілы ззаду...

Уладзік тым часам далоў не пазіраў, углядаўся ўдалячынь. Паварушыўся на бярозе, і мох, сухія галінкі пасыпаліся на немцаў. Урэшце, мабыць, Уладзя ўсё-такі паглядзеў уніз. Бо на нашых вачах кулём зваліўся з бярозы і трапіў якраз на немца, што сядзеў пад ёю. Той толькі войкнуў. А другі, як быў, босы, без мундзіра, з крыкам «партызанен-партызанен» рынуўся ў лазнякі.

Уладзік жа падхапіў аўтамат, мундзір і гумавыя боты, і таксама шыбануў да нас. З гадзіну мы пёрліся цераз лазняк. Таіцца няма чаго — страх такі добра падганяў.

А калі крыху супакоіліся, пачалі пытаць у Уладзіка, што ён адчуў, як убачыў немцаў?

— Дальбог, не памятаю. Нейкае замарачэнне найшло. Апусціў рукі і шугануў уніз...

— Ну а трафеі як жа прыхапіў?

— Таксама не памятаю. Напэўна, тут звычка спрацавала. Бачу, ляжаць аўтамат і мундзір, вось і не мог пакінуць, прыхапіў...

На Блудны мы перабраліся ноччу і фарбу ўсё ж-такі дасталі. А Уладзік папрасіў нас, каб нікому ў атрадзе не расказвалі пра яго ўчынак. «Смяяцца будуць, што на фашысце вярхом ехаў».

Шмат прайшло з тых часоў. Можна ўжо і расказаць...

Амяльян ШУРПАЧ.

СТАРОНКІ ГЕРАІЧНАГА МІНУЛАГА

Дата 3 ліпеня ўпісана ў гісторыю Беларусі яркай старонкай гераічнай доблесці фарватэкоў і працаўнікоў тылу, партызан і падпольшчыкаў, якія вызвалілі краіну ад нямецкіх захопнікаў, здабылі свабоду для свайго народа. На адной з нядаўніх сустрэч прадстаўнікі Беларускага саюза мастакоў і спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук абмеркавалі, як сёння захоўваецца памяць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны творцамі і навукоўцамі і што варта паспешыць паглядзець кожнаму па гэтай тэме ў музейных установах.

— Для нашых творчых людзей Вялікая Айчынная вайна — гэта заўсёды персанальная гісторыя. Іх чытаеш, калі прыходзіш на выстаўкі нашых мастакоў, калі бачыш работы творцаў старэйшага пакалення. Беларускі саюз мастакоў існуе ўжо амаль 85 гадоў. І больш за палову тых, хто ўзначальваў наша аб'яднанне, былі з ліку людзей, якія прайшлі дарогамі вайны. І гэта заўсёды была іх гісторыя, якую яны прыносілі ў нашу арганізацыю, — адзначыла **намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Рыхтуючыся да нашага вялікага праекта «Фарбы Вялікай Перамогі», мы падлічылі, што 143 сябра Беларускага саюза мастакоў былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны і не ўсе з іх вярнуліся. Хтосьці быў проста салдатам і рабіў замалёўкі, іншых залучалі працаваць творча. Напрыклад, Яўген Зайцаў працаваў у газеце «Раздавім фашысцкую гадзіну». Ці згадаем Уладзіміра Сухаверхава, Паўла Масленнікава, Віктара Грамыку... Дзякуючы ўсім ім тэма вайны ў беларускім выяўленчым мастацтве заўсёды гучала і заўсёды з'яўляецца важнай. У Палацы мастацтва да канца ліпеня працуе вялікі выставачны праект «Фарбы Вялікай Перамогі». Ён дае магчымасць наведвальнікам убачыць зрэз творчасці беларускіх мастакоў, якія сёння працуюць над тэмай тэмай і чэрпаюць у ёй сваё натхненне.

Таксама амаль таварыства кожны з нас можа знайсці ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

— Самым маштабным праектам з'яўляецца экспазіцыя «Адзінай памяці верныя». Першая частка гэтай выстаўкі была адкрытая яшчэ летась. І была прымеркавана да даты вызвалення першага населенага пункта Беларусі ў гады вайны. Асаблівасцю выстаўкі з'яўляецца тое, што там прадстаўлены не толькі экспанаты нашага музея, але і экспанаты з музейных устаноў Узбекістана, Азербайджана, Расійскай Федэрацыі, а таксама з нашых абласных і раённых музеяў, — распавяла **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Рыма РУМ.** — А ў Маскве на ВДНГ адкрыўся выставачны праект, прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі. Там мы імкнуліся паказаць той максімум, які маем у сваіх фондах, на выстаўцы мы дэманструем больш як сто музейных прадметаў. І там можна прасачыць паэтапна вызваленне абласцей нашай краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Музей наш таксама актыўна займаецца папаўненнем сваіх фондаў. І ў рамках нашага праекта «Адкрытыя фонды» з сакавіка дзённічае часовая экспазіцыя «Музей. Час. Памяць». Там мы дэманструем апошнія паступленні, у прыватнасці, можна ўбачыць асабістыя рэчы герояў вайны. Іван Шумноў, напрыклад, капітан, камандаваў батальёнам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Там пазнаёміўся са свайй будучай жонкай, якая была фельдшарам. Так франтавыя дарогі звялі два лёсы. У Дзень Незалежнасці на гэтай выстаўцы будзе працаваць майстэрня па рэстаўрацыі, і наведвальнікі змогуць адчуць сябе ў нязвыклай ролі.

З ліпеня ў музеі наведвальнікаў чакае куратарская выстаўка «Адзінай памяці верныя». Для школьнікаў і студэнтаў пад гэтую выстаўку распрацаваны віктарыны, аўдыягід. Яшчэ будзе працаваць «Прастора музея для дзяцей», дзе наведвальнікаў чакаюць разнастайныя майстар-класы, напрыклад па стварэнні святочных паштовак, гульні. А ў філіяле музея «Вострая мужнасці і смутку» днём можна наведаць бясплатныя экскурсіі.

Алена ДРАПКО.

Адным невядомым салдатам стала менш

Як праз 83 гады высветлілі імя загінулага лётчыка

Нярэдка прапануецца нам, падлеткам, напісаць сачыненне пра гераіу нашага часу. І адразу шукаеш у памяці яскравыя, захапляльныя і гераічныя подзвігі сучаснікаў. Вядома, такія людзі ёсць. Але існуюць і іншага кшталту чалавечыя ўчынкі, не менш важныя і каштоўныя для краіны, грамадства. Людзі, якія іх здзяйсняюць, ні з кім не ваююць, яны не вызначаюцца сілай і здароўем, не паказваюць сваю адвагу ў экстрэмальных умовах. Але яны — Грамадзяне з вялікай літары. Простыя, сціплыя, з добрымі душой і сэрцам, цвёрдым чалавечым стрыжнем, здаровай грамадзянскай пазіцыяй.

Таццяне Фёдараўне Петрушковай, жыхарцы горада Буда-Кашалёва, давялося пастукацца не ў адны дзверы службоўцаў. Але пажылая жанчына не адступала ад задуманага.

Год таму пайшоў з жыцця яе муж Пётр. Прасіў пахаваць яго на маленькіх сельскіх могілках мястэчка Юхны Губіцкага сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна поруч з магіламі мамы і бабулі. Горкім быў гэты год для ўдавы Пятра. Нярэдка бывала яна ў яго на магіле. І мімаволі кідала погляд на безназоўную магілу невядомага лётчыка, якога знайшлі ў вайну побач са збітым самалётам. Усе восем дзесяцігоддзяў жыхары Юхнага памяталі пра яго, часта задавалі сабе пытанне: хто ж ён? Магчыма, у яго жывуць родныя, якія не ведаюць пра гэту магілу. Нябожчык Пётр са сваім сябрам падфарбоўвалі металічны абеліск з зоркай. А іншыя вяскоўцы не дазвалялі, каб на магіле героя быў непарадак. Але гады зрабілі сваю справу. Спусцеў Юхны, некалі шумны і людны. Моладзь падалася ў гарады, старыя знайшлі свой супакой на могілках.

Таццяна Фёдараўна ўсё часцей стала хвалявацца, што тонкая нітачка памяці хутка можа абарвацца, шанцаў вызначыць імя героя не застанецца. Гэтага яна ўсім сэрцам не магла дапусціць. Яе Пётр так спадзяваўся, што здарыцца нешта невераголнае, і яны даведаюцца імя лётчыка. Праз нейкі час Таццяна выйшла на спецыяліста па ўшанаванні з Буда-Кашалёўскага раёна Жанэту Грышыну. Жанэта Анатолеўна нямала праектаў ажыццявіла з удзельнікамі пошукавага клуба «Пунсовыя пагоны» Гомельскай кадэцкай вучэльні. Вось і ў гэты раз вырашыла параіцца з пошукавікамі. І не памылілася.

Вогненнае неба 1941-га...

Таццяна Фёдараўна неаднойчы чула ад свекрыві і мужа гісторыю пра загінулага лётчыка. Дакладная трагічная дата сцёрлася з памяці вяскоўцаў. Яны памяталі, што быў пачатак вайны, гарачае лета. У мястэчку ўжо адправілі на фронт бацькоў, мужоў, братоў. Засталіся жанчыны, дзеці і старыя. Яшчэ была ў палях работа. А ў небе было неспакойна. Над мястэчкам праляталі савецкія самалёты. Бамбілі пераправы, масты, нямецкія калоны пад Жлобінам, Рагачовам, Бабруйскам.

У адзін з дзён на пачатку ліпеня народ выбег з хат ад злавеснага рокату. Па небе на невялікай вышыні над мястэчкам, пакідаючы шлейф дыму і агню, пікіраваў савецкі самалёт. Ледзь працягнуўшы за вясковыя вуліцы, ён з грукатам, выбухаючы, упаў недалёка ад калгасных адрын у лесе. У вясковых вокнах павылятлі шыбы. Але людзі, не разважаючы, кінуліся да самалёта. Раптам атрымаецца выратаваць лётчыкаў?.. Недалёка ад палаючай машыны яны ўбачылі загінулага члена экіпажа. Другі лётчык завіс на парашутных стропах на галіне дрэва. Здымаючы яго, вяскоўцы зразумелі, што ён жывы, паспшаліся аднесці ў адну з хат. Загінулага адцягнулі ад палаючай машыны. Дзядуля Пятра запрог каня і разам з жанчынамі адвёз яго на могілкі, дзе пахавалі і паставілі дубовы крыж.

Увечары праз мястэчка праходзілі нашы войскі, яны і забралі выжыўшага пілота, што і выратавала яму жыццё.

Па старонках баявых запісаў

Свой пошук мы пачалі з вывучэння вайсковай сітуацыі летам 1941 года на тэрыторыі Беларусі. Асноўную баявую нагрузку з паветра з першых дзён вайны нёс 103 бліскабамбардзіровачны авіяцыйны полк. Ён сфарміраваны на базе 43-й змешанай авіябрыгады Харкаўскай вайсковай акругі 5 мая 1938 года на падставе загаду камандуючага Харкаўскай вайсковай акругай у горадзе Харкаве на самалётах Су-2.

Ноччу 28 чэрвеня 1941 года камандзір палка падпалкоўнік Міраненка Павел Іванавіч атрымаў загад са штаба 21-й Арміі Цэнтральнага фронту, у склад ВПС якой увайшлі 103 ББАП, зранку ўсімі самалётамі наносіць удары па варожых калонах на Заходнім фронце. На гэтым фронце полк ваяваў у перыяд з 29.06.1941 да 15.08.1941. Страты палка ў гэты перыяд склалі 38 чалавек лётнага саставу. Намі ўстаноўлены ўсе даныя гэтых людзей. Месцы пахавання вядомыя ў некаторых чалавек. Іншыя дагэтуль лічацца зніклымі без вестак...

Промысел божы і рэдкая ўдача

Добрыя намеры шматлікіх людзей зліліся разам, і бясцэннай узнагародай для іх стала чаканая праўда. І архіўныя даследаванні, і аповеды сваякоў сведкаў трагедыі ў небе над Юхным, і неверагодная знаходка ўспамінаў пілота СУ-2, які выжыў, склаліся ў выразную карціну, якая ўжо не пакінула сумневаў і стала канцавым пунктам на шляху да ўшанавання героя Вялікай Айчыннай вайны. Штурман-бамбардзір таго самага самалёта 83 гады лічыўся без вестак зніклым і ляжаў у безназоўнай магіле на сельскіх могілках у мястэчку Юхны.

Што ж расказаў калегам той пілот СУ-2 Валерый Плотнікаў, які выжыў, а тыя, у сваю чаргу, публіцыстам? «Тры самалёты пад камандаваннем Балдзірыхіна Фёдара Захаравіча, 1907 года нараджэння, выдатна перакрылі цэль бомбамі і са знішэннем ішлі на сваю тэрыторыю. Тым часам на іх напалі варожыя знішчальнікі. Штурманы адбіваліся да апошняга патрона. Але і гэтым разам сілы былі няроўныя. Лётчыкі бачылі, як загарэўся самалёт малодшага. палітрука Плотнікава Валерыя Паўлавіча са штурманам Уласенкам Іванам Фролавічам, зваліўся ў лес і выбухнуў. Але яны не маглі бачыць, як у момант удару аб зямлю Плотнікава выкінула з самалёта і закінула на кроны дрэваў, дзе ён і павіс, зачапіўшыся стропамі... Доўга давялося б Валерыю вісець, калі б не мясцовыя жыхары, якія не толькі вызвалілі лётчыка з гэтай пасткі, але і аказалі патрэбную дапамогу. Праз тыдзень Плотнікаў быў у родным палку. Іван Уласенка загінуў. Бамбілі калоны праціўніка на дарогах Бабруйск — Жлобін і Бабруйск — Рагачоў».

«Гэты дзень мы набліжалі, як маглі»

У гэты дзень на могілках ва Юхным было шмат неабыякавых людзей. Не, ніхто спецыяльна не вызначаў даты гэтага мерапрыемства, так супала 21 чэрвеня 2024 года... Так, напярэдадні даты пачатку Вялікай Айчыннай вайны. А праз пару тыдняў — Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 83 гады з дня смерці лейтэнанта Івана Фролавіча Уласенкі. Таццяна Фёдараўна не хавала слёз. Цешыўся гэтай падзеяй і Генадзь Іванавіч Катляроў, выхадзец Юхтнага, які далучыўся да нашых пошукаў, апытаваючы сваіх сваякоў-старажылаў. На адну магілу невядомага салдата стала менш на тэрыторыі Губіцкага сельсавета. І гэта не магло не цешыць яго старшыню Яўгена Некрашэвіча. Да нас далучыліся супраціўнікі раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Кіраўнік гэтай службы Сяргей Халдай разам з калегамі ўзяў пад патранат магілу штурмана. Спецыяліст па ўшанаванні Жанэта Грышына паставіла на ўлік пахаванне, афармляе патрэбныя дакументы для ўшанавання героя.

Удзельнікі пошукавага кадэцкага клуба дапамаглі старэйшым пафарбаваць абеліск на магіле Івана Уласенкі, замацаваць партрэт і таблічку з яго прозвішчам і імем. У пошукавікаў атрымалася знайсці далёкіх сваякоў Івана Фролавіча і даведацца некаторыя даныя з яго біяграфіі: кадравы афіцэр 1918 года нараджэння, выхадзец сяла Дзмітрава Почапскага раёна Бранскай вобласці. На момант смерці яму было 22 гады, жанаты. Жонку звалі Любоў. У 1941 годзе ў яго нарадзілася дачка Вікторыя. Вядома, што ў Івана Фролавіча ёсць двое ўнукаў, якіх мы шукаем і спадзяемся, што знойдзем.

Максім МАСЛЕНЧАНКА,
Андрэй ЗЫБЛЕЎ,
кадэты Гомельскага кадэцкага вучылішча.

З нагоды

ТРЫУМФ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Менавіта так можна назваць прысваенне Мінску звання «Горад-герой»

Гэта адбылося 50 гадоў таму, 26 чэрвеня 1974 года. Ганаровае званне «Горад-герой» было прысвоена беларускай сталіцы разам з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». За стойкасць і мужнасць жыхароў у барацьбе з фашызмам, абарону ў гады Вялікай Айчыннай вайны такога гонару ўдастоены 12 гарадоў на постсавецкай прасторы. Але чаму Мінску — пазней за астатнія гарады? І якую ролю ў гераічным супраціўленні акупантам выконвала газета «Звязда»? На гэтыя і іншыя пытанні знайшлі адказы ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

ФАШЫСЦКАЯ ПРАПАГАНДА І МІНСКАЕ ПАДПОЛЛЕ

У гады Вялікай Айчыннай вайны нямецкія акупацыйныя ўлады рабілі ўсё магчымае, каб дыскрэдытаваць работу падпольшчыкаў: распаўсюджвалі актыўна чуткі, распавядалі небыліцы пра тое, што нібыта мінскія падпольшчыкі супраціўнічаюць з гестапа, тлумачыць **малодшы навуковы супрацоўнік Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Кацярына ЦЕРАШКОВА.** «Толькі ўявіце: Мінск сам па сабе акупіраваны, там усталяваа іншая ўлада. Гітлераўцы зрабілі ўсё магчымае, каб ачарніць дзейнасць падпольшчыкаў. Прымаюча да ўвагі гэты факт, неабходна было даказаць, што падпольшчыкі не супрацоўнічалі з імі. Таму доўгія гады вялося следства», — кажа яна.

Праз тыдзень пасля пачатку вайны Мінск быў захоплены. Але ён не спыніў супраціўлення. 1100 дзён і начэй змагаўся горад, жывучы ва ўмовах акупацыі: толькі на тэрыторыі Мінска дзейнічала звыш 20 аддзяленняў і філіялаў канцлагераў, куды траплялі не толькі ваеннапалонныя, але таксама мірныя жыхары, яўрэі і замежнікі. Сталіца была знішчана практычна на 80 %. У такіх цяжкіх умовах ужо да зімы 1941 года ў горадзе дзейнічала каля паўсотні разрозненых падпольных груп. Неўзабаве ўдалося аб'яднаць частку з іх пад кіраўніцтвам створанага Мінскага гарадскога падпольнага камітэта партыі.

«Многія ведаюць, што Мінск — горад-герой. Аднак людзі памылкова мяркуюць, што гэта ганаровае званне было прысвоена сталіцы за абарончыя баі ў 1941 годзе. Але ж Мінск захапілі ўжо праз тыдзень пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны. З тых часоў у сталіцы не пераставала дзейнічаць падполле. Пасля аб'яднання ў Мінскі гаркам іх дзеянні становяцца скаардынаванымі і структураванымі», — адзначае Кацярына Церашкова.

Баявым органам гаркама стаў Ваенны савет партызанскага руху (ВСПР), утвораны ў верасні 1941 года. Кіраўніцтва ВСПР прарабіла вялікую работу па арганізацыі партызанскіх груп і атрадаў, камплектаванні іх людзьмі, медыкаментамі, зброяй і іншай маёмасцю. Пад кіраўніцтвам І. Казінца, М. Гебелева, Г. Смаляра і М. Прусліна ў гета актыўна дзейнічалі 22 падпольныя групы, якія аб'ядноўвалі больш як 300 чалавек. На іх баявым рахунку дыверсійныя акты і сабатаж на нямецкіх прадпрыемствах і чыгуначным вузле, каля 5000 людзей, выведзеных з гета ў партызанскія атрады.

На баявым рахунку мінскага падполля больш чым 1500 дыверсій. Самая вядомая з якіх — знішчэнне карніка беларускага народа Вільгельма Кубэ. За гэты подзвіг Алена Мазанік, Марыя Осіпава і Надзея Траян былі ўдастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

Яшчэ адзін герой мінскага падполля — урач, прафесар медыцыны Яўген Клумаў. У пачатку вайны разам са сваёй сям'ёй спрабаваў эвакуіравацца, але не паспеў. Вярнуўшыся ў сталіцу, прапанаваў садзейнічанне мінскаму падполлю.

«Яўген Уладзіміравіч аказваў медыцынскую дапамогу параненым чырвонаармейцам, партызанам і падпольшчыкам. Дапамагаючых патрыётам пазбегнуць прымусовага вывазу на работы ў Германію, ён выдаваў ім фіктыўныя даведкі аб непрацаздольнасці. Яўген Уладзіміравіч дзейнічаў пад псеўданімам Самарын. Шмат медыкаментаў ён перадаў у распаражэнне народных мсціўцаў, што дазволіла абсталяваць два партызанскія палявыя шпіталі. За сям'ёй Клумавых было ўстаноўлена сачэнне. Яўгена Уладзіміравіча і яго жонку арыштавалі. Утрымлівалі іх у турме, затым у лагеры па вуліцы Шырокай. І нават тут доктар Клумаў застаецца верны сваёй прафесіі: аказвае медыцынскую дапамогу іншым зняволеным. Гестапаўцы спрабавалі схіліць буйнога спецыяліста на свой бок. Клумаў адхіліў прапанову аб супрацоўніцтве. 10 лютага 1944 года прафесар Клумаў і яго верная жонка Галіна Мікалаеўна загінулі ў машынедушагубцы», — распавяла навуковы супрацоўнік.

Званне Героя Савецкага Саюза прафесару Клумаву было прысвоена ў 1965 годзе. У Мінску яго імем названы вуліца, завулак і 3-я клінічная бальніца. На будынку бальніцы ўстаноўлена мемарыяльная дошка. У наш час маладыя медыкі пачынаюць свой працоўны шлях з клятвы доктара Клумава.

«Былыя падпольшчыкі доўгія гады змагаліся за адналенне гістарычнай справядлівасці. Пасля вызвалення Мінска па падазронні ў супрацоўніцтве з акупантамі органы дзяржбяспекі арыштавалі звыш 200 удзельнікаў мінскага падполля. Большасць з іх пасля былі асуджаныя да розных тэрмінаў пазбаўлення волі. У верасні 1959 года па выніках работы камісіі бюро ЦК КПБ палкам зняло абвінавачанні з Мінскага падпольнага гаркама», — дадала Кацярына Церашкова.

Вялікую ролю ў змене грамадскай думкі адыграла кніга І. Новікава «Руіны страляюць на ўпор», выдадзеная ў 1963 годзе напярэдадні святкаванняў 20-й гадавіны Вялікай Перамогі і прысвечаная гераічнай барацьбе мінскага падполля.

Дарэчы, П. М. Машэраў, стаўшы першым сакратаром ЦК КПБ, працягнуў працу па рэабілітацыі мінскага падполля. Пяць мінскіх падпольшчыкаў: І. Казінец, І. Кабушкін, У. Амельянюк, Я. Клумаў і Н. Кедышка былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза пасмяротна. Уклад мінчан у агульную перамогу над ворагам быў па вартасці ацэнены: у снежні 1966 года Мінск узнагароджаны ордэнам Леніна.

У 1974 годзе напярэдадні святкавання 30-годдзя вызвалення БССР у трох красавіцкіх нумарах газеты «Известия» выйшаў артыкул «1100 дзён» М. Матукоўскага, прысвечаны подзвігам мінскіх падпольшчыкаў. Артыкул асабіста рэдагаваў П. М. Машэраў.

26 чэрвеня 1974 года быў падпісаны ўказ аб прысваенні Мінску гераічнага звання «Горад-герой» з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». Цырымонія ўручэння ўзнагарод адбылася праз чатыры гады — 25 чэрвеня 1978 года.

«За праяўленую мужнасць і гераізм 600 удзельнікаў мінскага падполля былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, восем чалавек атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. Імёны мінскіх падпольшчыкаў увекавечаны ў назвах вуліц», — заключыла навуковы супрацоўнік.

РЭДАКТАР ПАДПОЛЬНАЙ «ЗВЯЗДЫ»

Штодзённа рызыкуючы жыццём, падпольшчыкі здабывалі і перадавалі партызанам важную разведінфармацыю, праводзілі вялікую прапагандысцкую работу, выпускалі лістоўкі і газеты «Звязда», «Веснік Радзімы» і іншыя, распаўсюджвалі зводкі Саўінфармбюро.

«Сям'я Амельянюк — вядомыя мінскія падпольшчыкі. Уладзімір Амельянюк якраз той, хто стаяў каля вытокаў мінскага падполля як такога. Да зімы 1941 года ў Мінску дзейнічала каля паўсотні разрозненых груповак. Неўзабаве частка з іх аб'ядноўваецца пад камандаваннем Мінскага гаркама. Менавіта Уладзімір Амельянюк стаяў на чале гэтых дзеянняў, — распавяла Кацярына Церашкова. — Яго галоўная асаблівасць і адметнасць у тым, што ў 1942 годзе ён становіцца галоўным рэдактарам газеты «Звязда», якую выпускаў Мінскі гаркам пад носам у гітлераўцаў. За 1942 год выйшла чатыры нумары газеты. Уладзімір Амельянюк быў галоўным рэдактарам першага выпуску».

У момант, калі Уладзімір Амельянюк збіраў матэрыялы для другога выпуску газеты, яго высочваюць гітлераўцы і забіваюць. Яго бацька, які таксама браў актыўны ўдзел у падпольнай дзейнасці, неўзабаве быў арыштаваны і прысуджаны да смяротнага пакарання. Маці Уладзіміра Амельянюка памерла ў 1945 годзе, так і не даведаўшыся аб тым, што яе сын быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Дарэчы, Уладзімір Амельянюк — адзін з першых мінскіх падпольшчыкаў, які быў удастоены такога ганаравога звання.

Выпускі газеты «Звязда» друкавалася ў канспіратыўных кватэрах. У Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны знаходзіцца экспазіцыя падпольнай кватэры Таццяны Якавенкі — гаспадыні канспіратыўнай кватэры, на якой друкаваліся трэці і чацвёрты выпускі газеты.

«Газета «Звязда» — моцны пералом у гітлераўскім асяроддзі. Напярэдадні першага выпуску часткі мінскіх падпольшчыкаў была рассакрэчана. Амаль усіх разагналі, частка была арыштавана, ліквідавана. Работа была не з лёгкіх: становіцца больш жорсткім тэрор, пагаршаецца становішча ў Мінску, ідзе жорсткі татальны кантроль, але ўсё ж выходзіць першы нумар газеты «Звязда», тым самым даючы зразумець, што мінскае падполле жывое, яно ўсё яшчэ дзейнічае і з кожным днём наблізае савецкі народ да Перамогі», — працягнае аповед Кацярына Церашкова.

Яна звяртае ўвагу на тое, што мірнае насельніцтва Беларусі не заўсёды мела ўяўленне аб тым, што сапраўды адбываецца на фронце і ў тыле. На акупацыйнай тэрыторыі дзейнічала актыўная нацысцкая прапаганда, якая ўводзіла людзей у зман. Выпускі газеты «Звязда», зводкі Саўінфармбюро перш за ўсё былі накіраваныя на тое, каб данесці правільную інфармацыю да людзей: пра тое, што Масква не здадзена, падполле жыве, а партызанскія атрады працягваюць барацьбу з ворагам.

«Ролю прэсы часоў вайны немагчыма пераацаніць. Газета «Звязда», зводкі Саўінфармбюро, розныя лістоўкі ўпэўнена наблізалі савецкі народ да Перамогі. З ворагам вялася жорсткая барацьба не толькі зброяй, але і словам. Партызанскія атрады актыўна распаўсюджвалі газеты і лістоўкі, выпускалі баявыя лісткі — свайго роду летапіс жыцця партызан. Яны друкавалі баявыя лісткі самі для сябе, каб валодаць усёй аператыўнай інфармацыяй. І калі гэта неабходна было ў партызанскіх атрадах, то што ўжо казаць пра мірнае насельніцтва, якое не мела ўяўлення аб тым, што адбываецца за рысай горада», — дапоўніла Кацярына Церашкова.

БАІ ЗА СТАЛІЦУ І МІНСКІ КАЦЁЛ

Аперацыя па вызваленні Мінска ў рамках Беларускай наступальнай аперацыі «Багратыён» пачалася 29 чэрвеня 1944 года, калі войскі 1-га і 3-га Беларускіх франтоў у збежных напрамках нанеслі ўдар па нямецкіх частках на подступах да горада. 30 чэрвеня савецкія падраздзяленні ўзялі Слуцк, што знаходзіцца ўсяго за 100 кілометраў на поўдзень ад сталіцы, выйшлі да Бярэзіны, фарсіравалі яе і працягнулі імклівае прасоўванне да галоўнай мэты. Вызначалася жорсткая барацьба за сталіцу Беларускай ССР.

«У Мінску было самае жорсткае супраціўленне — гэта два палкі пяхоты, узмоцненыя танкамі, збудаваныя доты, дзоты, барыкады. Частка вялікіх будынкаў была замініравана. Жыльля дамы і ўстановы былі практычна цалкам спалены. Мінск быў разбураны практычна на 80 працэнтаў, — адзначыла Кацярына Церашкова. — У тым ліку быў знішчаны адзін з мастоў у горад. Усё гэта справаджалася налётамі варожай авіяцыі. Нягледзячы на гэта, у сем гадзін раніцы баі вяліся ў цэнтры Мінска, а ўжо да дзевяці гадзін Чырвоная Армія знаходзілася на мяжы горада — Мінск быў практычна вызвалены. Да гадзіны дня баявая задача была выкананая».

З ліпеня 1944 года танкі з чырвонымі зоркамі на баках увайшлі ў Мінск, сустрэтыя радаснымі крыкамі гараджан, кветкамі і слязьмі. Менш чым за два тыдні спатрэбілася савецкім войскам, каб разграміць групу арміі «Цэнтр» — «сэрца» нямецкай ваеннай машыны, галоўны гонар фюрэра.

Адным з галоўных герояў вызвалення горада стаў гвардыі малодшы лейтэнант Дзмітрый Фролікаў, якому тады было ўсяго 26 гадоў. Яшчэ не разведзена, калі ўзвод Фролікава на вялікай хуткасці ўварваўся ў Мінск. Яго тры танкі ўтойліва выйшлі на паўночна-ўсходнюю ускраіну Мінска да Лагойскага тракту, змялі варожы рубеж абароны ў найбольш слабым яго месцы і атрымалі загад прарываца да цэнтра горада, пракладваючы дарогу асноўным сілам брыгады. У баі на вуліцах горада танкавы экіпаж Дзмітрыя Фролікава знішчыў самаходную гармату «Фердынанд», дзве зенітныя гарматы, супрацьтанкавую гармату.

З боку Лагойскага тракту ў Мінск уварваліся танкі 2-га гвардзейскага Татьянскага танкавага корпуса Аляксея Бурдзейнага. З поўначы ўвайшлі танкі 5-й гвардзейскай танкавай арміі, перадавыя наземныя падраздзяленні 31-й і 11-й гвардзейскай арміі. У сярэдзіне дня з боку цяперашняга Партызанскага праспекта — танкі 1-га гвардзейскага Данскога танкавага корпуса генерал-маёра танкавых войскаў Міхаіла Панова і наземныя часткі 3-й арміі 1-га Беларускага фронту. Да вечара супраціўленне праціўніка было канчаткова зламана.

У адным з ваенных данясенняў праход Чырвонай Арміі праз Мінск апісваецца так: «Танкі былі больш падобныя на велізарныя букеты кветак, а не на грозныя баявыя машыны». У гонар вызвалення сталіцы БССР у Маскве прагрымеў салют 24 артылерыйскімі залпамі з 324 гарматаў.

«З ліпеня 1944 года савецкія войскі не толькі вызвалялі сталіцу рэспублікі ад акупантаў, але і закрылі Мінскі кацёл. У акружэнне (вузлавымі пунктамі якога можна назваць сучасны пасёлак Сосны, а таксама Смілавічы і Абчак) трапілі галоўныя сілы 4-й і асобныя злучэнні 9-й арміі групы армій «Цэнтр» — каля 105 тысяч гітлераўцаў. У выніку жорсткіх баёў 70 тысяч гітлераўцаў было знішчана, 35 тысяч узята ў палон, у тым ліку 12 нямецкіх генералаў. На месцах гэтых бітваў сёння стаіць вядомы мемарыяльны комплекс «Курган Славы» — помнік, прысвечаны подзвігу воінаў 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў у Беларускай аперацыі.

203 тысячы партызан і падпольшчыкаў узялі ўдзел у аперацыі «Багратыён». Напэўна, самы значны этап — рэйкавая вайна. Толькі за трэці этап у ноч напярэдадні аперацыі «Багратыён» было ўзарвана 40 тысяч рэек. Партызаны і падпольшчыкі займаліся падрывам дзейнасці ў тыле ворага, здабывалі разведданыя для Чырвонай Арміі. Пасля вызвалення Беларусі 180 тысяч партызан папаўняюць шэрагі Чырвонай Арміі, 12 з іх сталі Героямі Савецкага Саюза, 20 — поўнымі кавалерамі ордэна Славы», — заканчвае экскурсію Кацярына Церашкова.

Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Віктара ДРАЧОВА.

У лабірынтах мастацтва

Міхаіл Чэпік і Павел Масленікаў. Два Курганы

Ужо 55 гадоў пад Мінскам стаіць велічны Курган Славы — народны помнік у гонар загінулых падчас вайны на беларускай зямлі воінаў. Два гады з усіх куткоў Беларусі і гарадоў — герояў СССР везлі зямлю людзі, каб насыпаць яе ў вялізны ўзгорак, бачны за шмат кіламетраў. Адкрыццё Кургана Славы адбылося 5 ліпеня 1969 года да 25-й гадавіны вызвалення Беларусі. І адразу ж ён стаў любімым матывам мастакоў. У калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея ёсць дзве карціны, якія паказваюць гэты помнік: «Курган Славы» аўтарства Міхаіла Чэпіка, напісаны практычна адразу ж пасля яго адкрыцця, і «Зямля беларуская» народнага мастака Беларусі Паўла Маслені́кава, які стварыў сваю карціну ў 1973 годзе.

Гэтыя жывапісцы добра ведалі адзін аднаго, у маладосці жылі ў адным доме каля Опернага тэатра. Яны разам працавалі ў тым тэатры: Масленікаў — мастаком-пастаноўшчыкам, Чэпік — мастаком-дэкаратарам. Масленікаў быў старэйшы на 11 гадоў, але абодва былі франтавікамі і слова «вайна» для іх было не пустым гукам.

Многія сцвярджаюць, што франтавікі не вельмі любілі ўспамінаць вайну: некаторыя з іх, наадварот, стараліся забыць яе, таму што ўспаміны гэтыя былі занадта цяжкія, пакутлівыя, вярэдзілі душу. Пражываць зноў ужо ў мастацтве гэты боль не хацелася. І Чэпік, і Масленікаў не сталі мастакамі-баталістамі, выбралі пейзажны жывапіс, якому аддаваліся даастатку.

КУРГАН МІХАІЛА ЧЭПІКА

Чэпік быў прызваны на фронт у 1942 годзе васямнаццацігадовым юнаком і прайшоў з баямі палову Еўропы, скончыўшы вайну ў Аўстрыі, пад Венай. На трох яго братоў маці атрымала пахаванкі і ўсё жыццё не магла змірыцца з гэтым. Міхаіл Чэпік быў кантужаны ў баі і працягнуў служыць санітаром у франтавым шпіталі. Павел Масленікаў ваяваў пад Масквой, затым іх часткі была перакінута ў Іран. Там ён сустрэў свою жонку, якая працавала сувязісткай, з якой пражыў доўгае жыццё.

Вайна няўмольна ўвайшла ў жыццё гэтых мастакоў, стала скразной, але не галоўнай тэмай іх творчасці. Выцесніць яе са свядомасці, забыцца не атрымлівалася. Вайна нагадвала аб сабе. Чэпік пасля кантузіі пакутаваў на галаўныя болі і нерваваць, быў дужа ўразлівы. Не мог прайсці міма параненай птушкі ці бяздомнага сабакі. Аб вайне і той, і другі распавядалі ў сям'і нячаста, але не аб подзвігах, а аб цяжкасцях франтавога побыту. Нібы дзівячыся, як можна было перанесці такое. Чэпік праверыў тры дні па поясе у вадзе ў балоце, што, вядома, не магло не адбіцца на здароўі. Масленікаў расказваў, што правёў некалькі дзён, лежачы на снезе пад Масквой, не мог нават паварушыцца — кулі свісталі над галавой, але не захваразў на запаленне лёгкіх, толькі ад флюсу страціў некалькі зубоў...

Масленікаў звярнуўся да ваеннай тэмы толькі на схіле гадоў. Чэпік — праз 12 гадоў пасля Перамогі напісаў першую ваенную карціну — «1941».

А вось другая карціна, «Курган славы» 1969 года, была закуплена Дзяржаўным мастацкім музеем БССР. Яна ўпершыню з'явілася на выставе 1975 года, прысвечанай 30-годдзю Перамогі, і на наступны год была набыта з персанальнай выставы Міхаіла Чэпіка ў калекцыю музея.

«Курган Славы» напісаны нібы з птушынага палёту, як карціна планетарнага, сусветнага маштабу. Яна паказвае вялізную прастору Зямлі, беларускія палі і невялікую вузкую палоску неба з хмарамі. Мемарыял намаляваны амаль на гарызонце і выглядае не як штучны ўзгорак, а як старажытны курган у гэтай пустэльнай прасторы бязмежных беларускіх палёў.

Карціна суровая, напісаная ў вохрыстай гаме, адрозніваецца ўрачыстасцю і велічнасцю беларускай прыроды і справы рук калавечых, якія здолелі ў гэтым чыстым полі ўзвесці новую версію старога кургана.

Дочкі мастака расказалі, як стваралася гэтая карціна. У 1965 годзе шматдзетнай сям'і Чэпікаў Саюз мастакоў выдзеліў зямлю пад будаўніцтва дачы ў вёсцы Слабада пад Мінскам. А ў лістападзе 1967 года за чатыры кіламетры ад вёскі пачалося маштабнае будаўніцтва Кургана Славы. Насып вялізнага 35-метровага земляного ўзгорка адбываўся літаральна на вачах мастака. Ад яго дома добра было відаць гэтую народную будоўлю. Ён на працягу двух гадоў з хваляваннем назіраў за ходам будаўніцтва, з маленькімі дочкамі часцяком падыходзіў да яго, рабіў замалёўкі, эцюды гуашшу і акварэллю ва ўсе поры года, восенню і летам, калі зацвітала грэчка на калгасных палях, п'янкая салодкім пахам. Дарэчы, на гэтых палях і на дачных участках нярэдкія былі выпадкі, калі адкопвалі ржавыя снарады, якія заселіся з часоў вайны.

Міхаіл Філіпавіч напісаў дзясяткі эцюдаў у рознае надвор'е. Задума карціны ўзнікла ў гэтыя гады. На падставе гэтых эцюдаў у майстэрні была створана маштабная работа. Чамусьці ён вырашыў не адлюстроўваць курган зблізку, а зрабіць панарамны краявід з высокай лініяй гарызонту. Яго зачароўвала сама ўрачыстасць гэтага ў вялізнай пустой прасторы, адцвілыя бязмежныя палі, электрычкі, якія беглі побач. У гэтым пахмурным дні ён здолеў злавіць тое таямніча бязмежнае і вечнае, што цягне мастака да спазнання і засваення бясконцасці прыроды. Чэпік, адзін з майстроў беларускага «суровага стылю», стварыў класічны эпічны пейзаж. У Чэпіка курган — узвышаны архаічны старажытны магільнік, сакральнае тварэнне.

Ён быў першым, хто захваяў Курган Славы ў маляўнічай мастацкай выяве. Цікава, што асабістыя адносіны да Кургана Славы як выявы знаёмага з дзяцінства аб'екта перадаліся і дзецям Чэпіка — мастачкам. У іх да яго асаблівае стаўленне: унуку Чэпіка толькі тры гады, але ён ужо пабываў на вяршыні Кургана, пераадолеўшы 241 прыступку.

КУРГАН ПАЎЛА МАСЛЕНІКАВА

Праз тры гады, у 1971-м, старэйшы сябра Чэпіка Павел Масленікаў, мастак-пастаноўшчык Опернага тэатра, паўтарыў той жа сюжэт ужо зусім з іншай інтанацыяй. Курган Славы натхніў і яго. Безумоўна, ён ведаў карціну Чэпіка і вырашыў зрабіць выяву Кургана па-свойму. Гэта было як бы своеасаблівае творчае спаборніцтва мастакоў.

Павел Васільевіч быў ужо ў сталым веку, меў значне заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, магутны актыўны мастацкі і грамадскі тэмперамент. Энергічны, валявы, дзейны, вельмі арганізаваны, у адрозненне ад сціплага і сарамлівага Чэпіка, ён шмат паспеў і ў жывапісе, і ў тэатры, і ў грамадскай дзейнасці — скончыў Акадэмію мастацтваў у Ленінградзе, быў рэктарам Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута, абараніў кандыдацкую дысертацыю па мастацтвазнаўстве, актыўна працаваў у Саюзе мастакоў. Масленікаў аб'ездзіў усю Беларусь на сваім аўтамабілі, ён быў вельмі мабільны, не ўяўляў сябе без працы на натуры, дзе пісаў хутка, у адзін прысест. Амаль усе яго карціны напісаны на натуры: уласны транспарт дазваляў вазіць у багажніку палотны сярэдняга фармату. Так ён звык працаваць у маладым і сярэднім узросце. У гэтым плане ён быў салідарны з імпрэсіяністамі, якія лічылі, што крыніца праўды жыцця толькі ў прыродзе. Гэта было для яго, рэаліста, справай прынцыпу. «Мастацкае сузіранне пачынаецца са здзіўлення», — часта паўтараў ён аксіёму Гегеля. «Натура — святая святых, быць праўдзе». «Прырода — гэта першы настаўнік. Яна ўсё дае... Жывапіс павінен адлюстроўваць рэальную прыгажосць прыроды. Толькі тады чалавек зможа павысіць сваю эстэтычную культуру».

Ён быў захоплены назіральнікам прыроды. Казаў: «Тое, што ў прыродзе возьмеш, з пальца не высмакчаш. Знаходзячыся на пленэры, даводзіцца працаваць вельмі хутка. Больш за дзве гадзіны наогул нельга — сонца рухаецца, асвятленне мяняецца. А перад заходам увогуле 30—40 хвілін. Трэба хутка ўхапіць колер і светло. Толькі шэры дзень дае магчымасць пісаць доўга». У маладыя і сталыя гады ён ніколі не даводзіў пейзаж у майстэрні — толькі на прыродзе.

«Зямля беларуская» створана напрыканцы 60-годдзя мастака. Карціна вялікага памеру, абагульнена па некалькіх натурных эцюдах у майстэрні. У яго іншы Курган Славы — велічны помнік народнай Перамозе, створаны чалавекам. Гэта — своеасаблівы «парадны партрэт» Кургана Славы ў блізкім набліжэнні, дзякуючы якому можна разгледзець усе дэталі помніка, лесвіцу, наверхы ў выглядзе штыкоў, машыны на шашы, нават малюсенькія кропачкі — людзей, якія ўзыходзяць да вяршыні Кургана. Масленікаў пісаў сакавіта, эфектна. Як мастак тэатра, ён і ў станковым жывапісе ўлічваў эфекты відовішчнасці, разбіваў прастору карціны на некалькі планаў. Тут ён стрымаў свой каляровы тэмперамент. Гама карціны крыху прыглушаная: «Беларуская прырода стрыманая, не як спадніца цыганкі. Тут усё пабудавана на нюансе».

Натурнасць дазваляе лічыць карціну Масленікава ўнікальным мастацкім дакументам з аднаго боку, а з другога — прыкладам гераічнага філасофскага пейзажа.

Цікава, як мастакі па-рознаму і парадаксальна назвалі свае творы. Чэпік даў назву «Курган Славы», хоць ён толькі відзнеецца на гарызонце, а Масленікаў — «Зямля беларуская», хоць галоўным матывам у карціне з'яўляецца менавіта Курган Славы.

Назва палатна Масленікава «Зямля беларуская» сімвалічная. Гэта не толькі абазначэнне месца падзеі. Карціна нясе філасофскі падтэкст, нягледзячы на канкрэтнасць намаляванага мемарыяла — Кургана Славы. Зямная прастора напоўнена светланосным небам і ўрадлівай зямлёй. Асноўная думка мастака — велічы подзвігу воінаў, якія вызвалялі родную беларускую зямлю. Калі Чэпік адвёў галоўнае месца беларускім палям, як успамінам аб арэне былых жорсткіх баёў, то ў карціне Масленікава адно з самых прыкметных месцаў займае воблачнае неба.

«Глядзі, якія аблокі!» — казаў ён дачцэ, мастацтазнаўцы Веры Масленікавай. — Вось бы перадаць гэты стан на палатне! Вось паспрабуй перанесці на палатно пастаянную зменлівасць святла, колеры, якія ўвесь час у руху. Калі б я толькі мог гэта зафіксаваць, адлюстраваць, выказаць у алеі гэтае захапленне і здзіўленне. Аблокі — гэта сусвет, космас, якы пераносяць нас у іншы свет — свет вечнасці, недасяжнасці і неспасцігальнасці».

Абедзве гэтыя карціны трапілі ў фонды Мастацкага музея. Карціна Масленікава як народнага мастака Беларусі некалькі гадоў дэманстравалася ў пастаяннай экспазіцыі музея, шмат разоў рэпрадукаваласа, а карціна Чэпіка засталася ў запасніках і выстаўлялася нячаста, усяго тры разы. Успед за гэтымі мастакамі многія беларускія жывапісцы потым малявалі Курган Славы. Але гэтыя дзве карціны былі першым мастацкім увасабленнем вобраза велічнага помніка. Яны ўжо сталі класікай беларускага жывапісу XX стагоддзя і, зрэшты, увасобілі новы від беларускага савецкага пейзажнага жывапісу — архітэктурны пейзаж, дзе галоўным героем быў ваенны помнік, за якім стаяў подзвіг народа.

Надзея УСАВА,
мастацтвазнаўца.

КРЭПАСЦЬ МУЖНАСЦІ, АДВАГІ І НЯЗЛОМНАСЦІ

Мае праўдзівыя эмоцыі пра Брэсцкую крэпасць

Прызнаюся, што яшчэ са школьных гадоў я быў да слёз узрушаны неверагодна непаўторным подзвігам абаронцаў Брэсцкай крэпасці. З часам гэтыя эмоцыі не прыцьмявялі, не хавалася, не знікалі, набывалі новыя адценні і новыя вышыні. Тыя агнявыя жорны вайны не здолелі перамалоць адвагу, мужнасць і непаўторна моцны, адчуты не толькі сэрцам, але і крывёю, усёй чалавечай сутнасцю патрыятызм савецкіх людзей, якія гатовы былі на любыя ахвяры дзеля абароны роднай зямелькі і сваіх суродзічаў. Калі хочаце, і сваіх перакананняў, свайго жыццёвага кредо. А тыя, яшчэ неспазнаныя жорны, так моцна сціснулі душы і целы абаронцаў крэпасці, намагаючыся перамалоць усё і ўсіх, што, ічылі фашысцкія нападоўцы, ніякага супраціўлення і быць не павінна. Памыліліся. Глыбока памыліліся. З самага першага ваеннага дня памыліліся. Бо менавіта Брэсцкая крэпасць стала пачаткам і яркім сведчаннем будучай перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Насуперак усім нападоўцам і ўсяму нядобраму.

Фота БелартА.

І не толькі ў гэтым памыліліся фашысты. Таму і стараліся з усіх сваіх тэхнічных магчымасцяў. Ды хай сабе гарэла ўсё і паўсюль, хай плавілася цэгла ў казематах, хай кіпела рачная вада, трымцела, а часам і палала ад агню паветра, хай распаленымі скразнякамі дыхалі казармы і падвалы, гэта не палохала абаронцаў, не выпальвала іх веры ў перамогу. Яны не маглі іначай. Не маглі здрадзіць найперш самі сабе. Адчайна і бязагляднa гераічна змагаліся, не паддавалася ворагу, без бою не саступалі ні пядзі (без перабольшання) свайго тэрыторыі. І дзеілі так без усялякага прымусу і панукі. Без падказак і дапамогі. У глыбокім, не першы дзень, акружэнні. Без усялякай інфармацыі. Без парады і спрыяння. Часта нават без дастатковай зброі. Неверагодныя і доўга не зразумелыя ў свеце паводзіны абаронцаў Брэсцкай крэпасці насуперак усяму сведчылі і сведчаць дагэтуль аб нязломнасці характараў і здольнасці савецкіх людзей-патрыётаў у самых складаных і смяротных абставінах змагацца. Змагацца і перамагаць. Не, не толькі і не столькі за сябе, як за тую зямлю, якую яны абаралі і песцілі ў мірны час, за той лад, якому яны прысягалі, за тых людзей, якія з павагай і разуменнем ставіліся да іх мірных у мірны час намаганняў адвесці ад роднага краю любую бяду і нягоду.

Тое перашае ўражанне засталося ў мяне на ўсё жыццё. Дапамагала зразумець непераадольную моц і сілу тых, хто абараняе свою зямлю, свой дом, сваю сям'ю, сваю маці. Нездарма ж тэзіс звыкла простым, але бездакорна-справядлівым словам называюць радзіму — Маці-Радзіма. Гэтыя эмацыянальна развагі выклікалі ў мяне наступныя абставіны.

З цікавасцю прачытаў у «Звяздзе» матэрыял Вячаслава Селяменева і Кастуся Лешніцы пра Брэсцкую крэпасць-герой, надрукаваны 5 снежня 2023 года пад рубрыкай «З архіўных крыніц». Дарэчы, усе матэрыялы гэтай рубрыкі для мяне чаканыя. Бо душа здаўна хінецца да прадзівай гісторыі. А калі сказаў «здаўна», то мушу прызнацца, што з даўняй даўна жывае нязводнае пачуццё ад таго, што на нашай беларускай зямлі беражліва захоўваецца не адзін такі незвычайна прадзівы помнік гераізму савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта сапраўды неверагодна непаўторнае сведчанне нашай нязломнасці ў барацьбе за свабоду самаіснаць, за жыццё будучых пакаленняў. Непрыдуманае і прадзівае сведчанне.

Гэта пацвердзіў і прагляд дакументальнага тэлефільма «Дзеці Брэсцкай крэпасці», паказаны на «Беларусь 3» 3 красавіка 2024 года. Гэта яшчэ раз вярнула мяне і мае пачуцці ў далёкія школьныя гады. Пра сёе-тое я ўжо расказваў, разважаў. Але эмоцыі, сапраўдныя эмоцыі, жывыць і сёння, яны яшчэ больш падкрэсліваюць мне, сённяшняму, праўдзівасць і сапраўднасць адчутага, спазнанага і перажытага тады, у далёкія ўжо дні.

Ішоў 1961 год. Я з вучнямі 7 класа Вялікалітаўскай васьмігодкі, што ў Нясвіжскім раёне, упершыню наведаў Брэсцкую крэпасць, тады яшчэ без заслужанага звання «Крэпасць-герой». З той пары ніколі не прамінаў магчымасці пабываць у гэтай мясціне непаўторнага і без усялякага сумневу доказнага сведчання сапраўднага жыцця сапраўдных патрыётаў, якія не столькі прамаўлялі гэтае слова, колькі жылі ім і з ім. Бо патрыятызм іх быў рэальны, натуральны, сапраўды выспелены ў душы. І таму абаронцы родная зямлі і яе насельніцкаў не маглі жыць іначай, не разважалі над пытаннем: змагацца ці не, абараняць ці не, рызыкаваць жыццём ці не. Змагаліся, абаранялі, рызыкавалі, гінулі. І калі б не гэткія іх адносіны да тагачасных смяротна небяспечных падзей, то ці маглі б мы сёння так удзячна разважаць над гэтым.

Як ні дзіўна, у самы першы раз майго спаткання з Брэсцкай крэпасцю мяне апанавалі чулівыя думкі. Хадзілі мы па крэпасці, пазіралі на руіны, на пашчапаныя кулямі і асколкамі снарадаў рэшткі сцен і не перастаралі здзіўляцца, як здолелі не такія шматлікія ў параўнанні з наступнаўчымі фашыстамі абаронцы супрацьстаяць іх шалёнаму націску. З усяго навакольнага, са слоў экскурсавода і ў мяне прачыналася адчуванне, што мы праз многа гадоў нібыта ўвачавідкі бачым, усімі сваімі эмоцыямі спазнаём тое, што некалі адбывалася тут, на гэтым невялічкім, але не спагненым ні здрадай, ні адступленнем, каваларку савецкай зямлі.

Стаяў я перад Цярэспальскімі варотамі і дзівіўся, як учалелі яны. Як захаваліся, хоць і моцна параненыя, гэтыя без аднаго года стагадовыя (на пачатак вайны) казармы, казематы і іншыя абарончыя пабудовы. Як ва ўсіх гэтых памяшканнях рэальна затоптаўваўся і праяўляўся пераможны і непераможаны дух абаронцаў. Слухаў словы экскурсавода, і нібыта ўвачавідкі паўставалі тыя невераглодна цяжкія гадзіны і дні. Менавіта Брэсцкая крэпасць дапамагала з усёй паўнатой і праўдзівасцю зразумець сэнс і пераможную моц савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. І гэта не проста высокія словы, гэта сама праўдзівая праўда. Экскурсавод наўздзіў для мяне называла даты.

24 чэрвеня: захоплены Вільнюс.

28 чэрвеня: акупаваны Мінск.

10 ліпеня: пачалося наступленне на Ленінград.

16 ліпеня: немцы ўвайшлі ў Смаленск.

26 ліпеня: пасля працяглай абароны акупаваны Магілёў.

А крэпасць насуперак усім і ўсяму жыве, змагаецца. Малюпасенечная кропка на больш як трохтысячакілометровым фронце ўздоўж заходняй граніцы СССР. Адважныя абаронцы ў поўным няведанні і акружэнні нават думкі не дапускаюць аб здачы, вядуць сваю апошнюю бітву за жыццё, за радзіму, за нас. Амаль да канца ліпеня не змаўкалі яе падвалы і казематы. Не задушылна абаронцаў злою ведзьмаю смага, не спапялілі пражэрлівы шал агнямётаў — толькі расплаўленай цэглай сплывалі на дол падвальныя скляпенні. Але не плавілася чалавечая мужнасць і байцоўскі дух. Гэта засведчылі надпісы-завяшчанні абаронцаў, звернутыя і да нас, сённяшніх. Апошняе па абарончым часе, вядомае нам: «Я умираю, но не сдаюсь! Прощай, Родина. 20/VII-41 г.». Мінуў амаль месяц з пачатку ваенных дзеянняў, а крэпасць не здалася, не была захоплена.

Прызнаюся без пахвальбы і без жадання прыўкрасіць тадышнія рэаліі: дагэтуль памятаю нават дробныя дэталі і эмоцыі ад той, самай першай, сустрэчы з непрыступнымі там, але таксама рэальнымі ва ўяўленні, абаронцамі крэпасці.

Мы, школьнікі, амаль цэлы дзень правялі сярод руін. Слухалі аповед экскурсавода, услухоўваліся ў краснасную цішыню і міжволі набіралісто таго прадзівага разумення ўсяго, што там адбывалася, якое ўжо ніколі не выветрывалася ні з памяці, ні з душы. А пасля экскурсавода самі, адны доўга блукалі на гэтай абпалёнай і мужнасцю загартаванай зямлі, дакраналіся да спражаных ацалелых і зруйнаваных сцен і нібыта набіралісто той мужнасці, той вернасці свайму доўгу, абавязку і празе дзейнічаць у імя дабра (не баяліся гэтых высокіх слоў і мы), якія на ўсю моц праявілі абаронцы крэпасці.

А надвячоркам, калі летняе сонца хілілася на захад, мусілі вяртацца на чыгуначны вакзал. Ішлі па бераэе ракі. Мой позірк міжволі ўпаў на яе. Я адразу ж спыніўся, быццам ногі мае прыраслі. Да неверагоднасці здзівіла незвычайная чырвань вады. Яркая, мігатлівая, каючая. Не паверыў, думаў, падалося. Стуліў некалькі крокаў. Але рака не памяняла чырвонага колеру.

— Ірына Уладзіміраўна, зірніце! — паклікаў я нашу настаўніцу.

А пасля ёй і маім аднакласнікам прапанаваў:

— Паглядзіце на раку. Яна ж чырвоная. Гэта... Гэта кроў... Кроў абаронцаў крэпасці... Як дагэтуль аддае перанасычаная змяля...

Не, не вечаровае сонца вінавата ў маіх — нашых — уражаннях. Гэта сапраўды праўдзівая праўда тагоа, вайеннага, ліхалецця. Праўда, якую ніякі пазнейшы час, ніякія развагі-меркаванні не змяняць і не адменяць. Бо — так было. На самай справе было.

І іншая сустрэча з крэпасцю-героем. Пазней, калі з 1971 года працаваў у БелТА, закончыўшы камандзіровачны дзень у Брэсце, не мог не прыйсці ў крэпасць.

Надвячорак. Музей ужо зачынены, але людзей на тэрыторыі крэпасці нямала. Я заўсёды жадаў пахадзіць тут, паслухаць крапасную цішыню, яшчэ раз зірнуць на ея музеефікаваныя і натуральныя руіны. І зноў мой позірк затрымаўся на незвычайнай для мяне дэталі. На гэты раз увагу забрала ўсё яшчэ зруйнаваная некалішняя гарнізонная царква. Дакладней, яе закратаваныя — каб руіны не зраблі нікому шкоды — вокны. А яшчэ дакладней — чырвоныя пінянерскія гальштукі на іх. Імі былі абвязаны ўсе жалезныя краты аконных праёмаў. Амаль загарызонтавае ўжо сонца сваімі пачырваленымі праменямі на ўсю вечаровую моц свяціла на іх. А лёгкі ветрык няспынна варушыў гальштукі. Мой голас, каб і захацеў, не быў бы спакойным, бо горла пераняў даўкі камяк. «Дык гэта ж тое, ваеннае, полыма, ад якога згарэла не толькі царква... А як жа было трывацьабаронцам?» І я нібыта зноў пачуў тыя, не раз чутыя па радыё, словы, якія нястомна паўтараў ахрыплы голас аднаго з абаронцаў: «Я крэпасць... Вяду бой...»

Хай дарую чытачы, але пра тое я выказаўся тады ж, пасля таго адчування, спазнанага ў вечаровай крэпасці.

Ну і, вядома ж, незабыўная сустрэча ў крапасным музеі з бібліятэкай. Дакладней, з кнігамі самага першага і сапраўднага адкрывальніка праўды аб крэпасці, даследчыка крапасного змагання і ўшанавальніка абаронцаў Сяргея Смірнова, які мэтуды самы высокі аўтарытэт і павагу ва ўсіх Савецкім Саюзе. Я не прамінуў раскасаць пра гэта ў сёмым нумары часопіса «Маладосць» за 1986 год. Каля 1100 тамоў перадалі Брэсцкай крэпасці пасля смерці пісьменніка. Большасць іх з аўтографамі ўдзячных аўтараў з усяго Савецкага Саюза. Мяне ж найперш зацікавілі кнігі нашых беларускіх творцаў. Гэта не толькі выданні пісьменнікаў, але і непасрэдных удзельнікаў вайны. Сярод іх — Заір Азгур, Васіль Быкаў, Пётр Калінін, Фёдар Рома, Іван Новікаў, Мікола Садкоўч, Максім Танк, Мікола Ткачоў.

Справядлівыя словы выказаў Васіль Быкаў пра самую адметную кнігу Сяргея Смірнова: «Яго бессмяротная «Брэсцкая крэпасць» (далей называюцца некаторыя іншыя творы ваеннай тэматыкі. — **А. Б.**) — пра ўсіх гэтых і многіх іншых герояў будуць з не меншай цікавасцю чытаць нашы нашчадкі, і іх душы, як і нашы сэрцы, будуць поўніцца захапленнем мужнасцю іх маладых продкаў».

Паколькі яшчэ са студэнцкіх гадоў я меў асаблівыя адносіны да створанага Іванам Мележам — пісаў студэнцкія працы па яго творах, — то найперш звярнуўся да дарункаў Смірнову ад роднага пісьменніка, якія захоўваліся ў крэпасці. Іван Мележ на выдадзеным па-рускі ў 1956 годзе ў Маскве «Мінскім напрамку» напісаў: «Сергею Сергеевичу Смирнову, с бесконечной благодарностью за внимание и за поддержку, в которой мы так часто нуждаемся и которую, увы, все еще очень нечасто находим у своих товарищей по ремеслу, с наилучшими пожеланиями — Иван Мележ. Москва, 21.11.56 г.». Сяргей Смірноў таксама падпісаў свае кнігі Івану Паўлавічу.

Іх прыязныя стасункі не абмяжоўваліся толькі аўтографамі. Былі і іншыя спосабы падтрымкі і выяўлення сваіх пачуццяў. Напрыклад, Іван Мележ выказвае «бесконечную благодарность» Смірнову і за тое, што Сяргей Сяргеевіч напісаў змястоўную станоўчую рэцэнзію на раман «Мінскае направление», якая змешчана ў часопісе «Военный вестник» за 1955 год.

А яшчэ раней Смірноў даслаў Мележу ліст, у якім засведчыў «удовлетворение, которое дал роман», свае адчуванні ад яго прачытання. «Вы написали настоящий роман о войне, и хочется поблагодарить за него Вас от имени участников войны, к числу которых принадлежу и я... Ощущение правды, большой человеческой правды не оставляет тебя, когда читаешь «Минское направление»».

Іван Мележ не праміну ў адказаць: «Ваше письмо так глубоко тронуло моё сердце. Спасибо Вам, добрый Вы человек! Недавно я прочитал и Вашу рецензию в «Военном вестнике». Она мне понравилась, понравилась той же искренностью, которую я ощутил и в письме, понравилась тем, что Вы так внимательно прочитали книгу, увидели там многое из того, что так трудно увидеть со стороны, и чего многие не умеют замечать. Меня тронуло, что Вы так основательно, так серьёзно говорите о книге».

Асабістыя кантакты і ліставанне не перапынялісяі і пазней. У 1973 годзе Іван Паўлавіч на новым выданні «Мінскога направления» ў сваім перакладзе напісаў: «Сергею Сергеевичу Смирнову-Брестскому, Лиепайскому и пр. в память того времени, когда мы были молоды и когда была написана эта книга, заново прочитанная и дапісанная, в соответствии с возможностями времени и опыта (общественного и личного). От благодарного автора — И.Мележ. 6.1.74. Хорошо бы, если бы Вы нашли время перечитать (хотя бы Черняховского!)».

Захоўваюцца ў кніжных зборах крэпасці і іншыя аўтографы Смірнова Мележу, іх абмен пісьмамі. Шчыры і крапанальны лісты. Сапраўдная прыязнасць існавала паміж гэтымі абапалнымі вайной людзьмі. Здружыла іх ваенная тэма, імкненне сказаць будучым пакаленням праўдзівую праўду аб вайне вуснамі непасрэдных удзельнікаў.

Брэсцкая крэпасць і да гэтай пары не зменшыла свайго эмацыянальнага ўздзеяння на мяне. Разумею, чаму няўмольны лекар час не можа загасіць крапасныя раны, чаму і сёння крывавяць свае чырвонасцю аплаўленыя сцены, васпавятыя ад асколкаў і куль. Бачу, як звечарэлая цішыня — ажно вушы закладвае — сцярэжа сонныя руіны, а нястомны пярун жагнае іх бліскамі маланак. І згадаюся, што асвяжальныя дажджы не даюць упыльцу металічным літарам на трох'ярусным некропалі, якія складваюцца ў прозвішчы абаронцаў і пякельна балючыя словы «Невядомы».

Мінаюць гады, дзесяцігоддзі, а Брэсцкая крэпасць-герой па-ранейшаму нястомна апрадзвае сваю назву і прызначэнне — ашчадна зберагае і аберагае памяць пра сваіх навекі несмяротных абаронцаў...

Анатоль БУТЭВІЧ.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Строительному унитарному предприятию «Гродненская СПМК».

Аукцион состоится 11.07.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129462 (назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – покрытие автодрома), общей площадью 2 425,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000001010570, площадью 0,2848 га (назначение – земельный участок для обслуживания сооружения специализированного транспорта), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Карского, 4. Лот 1 имеет обремнения со стороны 3-х лиц в виде аренды: - части асфальтобетонного покрытия, площадью 900,0 кв. м, сроком по 31.12.2024 г. - части асфальтобетонного покрытия, площадью 50,0 кв. м, сроком по 31.12.2024 г.; - части асфальтобетонного покрытия, площадью 400,0 кв. м, сроком по 31.12.2024 г.; - части асфальтобетонного покрытия, площадью 1500,0 кв. м, сроком по 31.12.2024 г. Условия проведения аукциона – условия оплаты: оплата полной стоимости объекта недвижимости производится не позднее 15 (пятнадцати) банковских дней с момента заключения договора
Начальная цена продажи	175 000 руб. (сто семьдесят пять тысяч) с учетом НДС
Сумма задатка	17 500 руб. (семнадцать тысяч пятьсот рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 09.07.2024 г. до 15.00**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.05.2023 г.	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony	

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ЧПУП «Керестеа» (продавец) извещает о проведении **12 июля 2024 года** повторного открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Наименование имущества
Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 324/С-10291 площадью 441,8 кв. м (здание механической мастерской, назначение здание специализированно автомобильного транспорта, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание). Капитальное строение с инв. № 324/С-8693 площадью 243,8 кв. м (здание гаража, назначение здание специализированное автомобильного транспорта, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание). Капитальное строение с инв. № 324/С-8694 площадью 144,5 кв. м (здание склада, назначение здание нежилое, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание). Капитальное строение с инв. № 324/С-8695 площадью 460,3 кв. м (здание склада, назначение здание нежилое, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание). Капитальное строение с инв. № 324/С-8691 площадью 78,0 кв. м (здание бани, назначение здание нежилое, составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание)
Капитальные строения расположены на земельных участках с кадастровыми номерами 325650100001002724, 325650100001002340, 325650100001002615 по адресу: Гомельская обл., Чечерский р-н, г. Чечерск, ул. Восточная, 90
Начальная цена продажи без НДС – 129 420,00 бел. руб. **Задаток** – 1 294,20 бел. руб.

Продавец: ЧПУП «Керестеа», г. Гомель, пр-т Ленина, д. 31, к. 2. Конт. тел. +375296436025.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 11.07.2024 г. в 17.00.

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте www.deloocenka.by.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.

Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **90 (девяноста)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки.

Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению филиала «Минский» открытого акционерного общества «Агрокомбинат «Дзержинский» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1: комплекс недвижимого имущества и оборудования в составе:
- **склад-холодильник** *(составные части и принадлежности: 3 (три) навеса)*, **инв. № 601/С-31936 общей площадью 145,8 кв. м;**
- **убойный цех** *(составные части и принадлежности: 2 (два) навеса)*, **инв. № 601/С-31941, общей площадью 1000,4 кв. м, с технологическим оборудованием «Szlachet-Stal»;**
- **столярный цех, инв. № 601/С-31938, общей площадью 460,1 кв. м;**
- **склад канцкормов** *(составные части и принадлежности: 2 (два) пристройки-навеса с автовесами)*, **инв. № 601/С-31943, общей площадью 402,2 кв. м;**
- **склад ГСМ, инв. № 601/С-31937, общей площадью 64,5 кв. м;**
- **сарай-гараж с/х** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 601/С-31929, общей площадью 553 кв. м;**
- **пункт техобслуживания, инв. № 601/С-31932, общей площадью 719,9 кв. м;**
- **птичник № 14, инв. № 601/С-31925, общей площадью 1329,2 кв. м;**
- **проходная, инв. № 601/С-31942, общей площадью 49 кв. м;**
- **мойка для машин, инв. № 601/С-31928, общей площадью 6,6 кв. м;**
- **мехмастерская** *(составные части и принадлежности: пристройка, беседка)*, **инв. № 601/С-31927, общей площадью 565,7 кв. м;**
- **котельная** *(составные части и принадлежности: навес, дымовая труба)*, **инв. № 601/С-31939, общей площадью 892,9 кв. м;**
- **гараж на 25 автомашин, инв. № 601/С-31926, общей площадью 506,9 кв. м;**
- **ветсанпропускник убойного цеха** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-31940, общей площадью 578,2 кв. м;**
- **административное здание** *(составные части и принадлежности: подвал, 2 (две) пристройки, котельная)*, **инв. № 601/С-31931, общей площадью 1072,1 кв. м;**
- **весовая** *(составные части и принадлежности: навес с автовесами)*, **инв. № 601/С-31934, общей площадью 15,2 кв. м;**
- **птичник № 1** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22689, общей площадью 1749,7 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 2** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22690, общей площадью 2003,8 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» для выращивания бройлеров напольного содержания;**
- **птичник № 3** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22691, общая площадь – 1752,7 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 4** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22692, общей площадью 1789,8 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» для выращивания бройлеров напольного содержания;**
- **птичник № 5** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22693,общей площадью 1753,2 кв. м, с оборудованием «Техна» для клеточного содержания кур-несушек;**
- **птичник № 6** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22694, общей площадью 1411,8 кв. м;**
- **птичник № 7** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки, 2 (две) навеса)*, **инв. № 601/С-22695, общей площадью 1424 кв. м;**
- **птичник № 8** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22696, общей площадью 1318 кв. м;**
- **птичник № 9** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 601/С-22697, общей площадью 1270,1 кв. м;**
- **птичник № 10** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22700, общей площадью 1910,4 кв. м;**
- **птичник № 11** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 601/С-22698, общей площадью 1311,6 кв. м;**
- **птичник № 15** *(составные части и принадлежности: 2 (две) пристройки)*, **инв. № 601/С-22699, общей площадью 1739,4 кв. м, с оборудованием «Big Dutchman» Evrovent-500 для клеточного содержания кур-несушек.**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623200000033000024 площадью 54,2646 га ***(право постоянного пользования)*** **по адресу: Минская область, Логойский район, Плещеницкий с/с, 4.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: прибрежная полоса р. Двинога, пл. 1,0000 га; водоохранная зона р. Двинога, пл. 38,5276 га; охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 3,6770 га:
- **цех переработки мяса** *(составные части и принадлежности: подвал, вход в подвал, навес)*, **с комплектом оборудования для производства колбас, комплексом копчения и камеры коптильной, инв. № 601/С-28939, общей площадью 410,6 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623200000033000063 площадью 0,1924 га** ***(право постоянного пользования)*** **по адресу: Минская область, Логойский район, Р-63, 67-й км. 1/2.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Двинога, пл. 0,1924 га; охранная зона линий электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0050 га; охранная зона линий электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0430 га; охранная зона придорожной полосы (контролируемая зона) автомобильных дорог, пл. 0,0785 га.

С полным перечнем оборудования можно ознакомиться у организатора аукциона.

Начальная цена с НДС (20 %) – **3 033 360,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **303 336,00** бел. руб.

Лот № 2 – земельный участок с инв. **№ 600/С-176408, общей площадью 327,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623981131060100077 площадью 1,1584 га** *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, Минский район, Гореанский с/с, 55, район д. Лисовщина.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000В, пл. 0,3126 га; зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения, пл. 0,7382 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **33 840,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **3 384,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов, а также оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лоту № 1 – 1 (одного) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 10 (десяти) процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rii.by.

Аукцион состоится **06.08.2024 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.08.2024** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра 8 (029) 145-17-40.

VHT-601088545

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	**Лот № 1. Изолированное помещение № 3 (гараж) с инвентарным номером 713/D-3903,** расположенное по адресу: Могилевская область, г. Климовичи, ул. Ленинская, 80-3, площадью 25,2 кв. м, год постройки – 1995. **Лот № 2. Изолированное помещение № 5 с инвентарным № 713/D-3905,** расположенное по адресу: Могилевская область, г. Климовичи, ул. Ленинская, 80-5, площадью 190,9 кв. м, год постройки – 1995
Начальная цена продажи	Лот № 1 – 11 280,00 рублей (одиннадцать тысяч двести восемьдесят рублей 00 копеек), в т.ч. НДС 20 %. Лот № 2 – 85 560,00 рублей (восемьдесят пять тысяч пятьсот шестьдесят рублей 00 копеек), в т.ч. НДС 20 %. Обязательное условие приобретения лота № 2: приобретение роплет в количестве 2 ед. и щитка утопленного типа общей стоимостью 1891,84 рублей (одна тысяча восемьсот девяносто один рубль 84 копейки) по отдельному договору
Сумма задатка	Лот № 1 – 564,00 рубля (пятьсот шестьдесят четыре рубля 00 копеек) – 5 %. Лот № 2 – 4278,00 рублей (четыре тысячи двести семьдесят восемь рублей 00 копеек) – 5 %
Открытый аукцион состоится	**08.08.2024 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 16.00 (с 12.30 по 13.15 обед) по 07.08.2024 включительно по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 71А-2, пятый этаж, кабинет 502
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в орган по государственной регистрации по месту нахождения объекта
Контактные данные	По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222) 752155, моб. 8029-169-39-68

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ о отчислай банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере по 1 лоту 564,00 рубля, по второму лоту 4278,00 рублей на счет No BY 69 AKBB 66708597000020000000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицам Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателям – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицам – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – 08 августа 2024 г. с 10.30 до 10.55. В случае не регистрации в выше назначенное время участник не допускается к участию в аукционе. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с

ШЛЯХАМІ 1943 - 1944 ВЫЗВАЛЕННЯ

СТАЛІЦУ І АСТРАВЕЦ ВЫЗВАЛІЛІ Ў АДЗІН ДЗЕНЬ

Як партызаны праз тры гады адказалі на нямецкі «бліцкрыг»

Ліпень 1944 года прынёс вызваленне Гродзеншчыне. І першым буйным цэнтрам на гэтым шляху стаў Астравец. Адметна, што знамянальная дата супала з вызваленнем сталіцы. Але калі Мінск вызвалялі пераважна воінскія часткі, тут галоўную ролю адыгралі партызаны, якія далучыліся да наступальнай аперацыі «Багратыён». Днём 3 ліпеня партызанская брыгада імя ЦК Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі разграміла варожы гарнізон у Астраўцы і трымалася да прыходу рэгулярнай арміі.

ІМКЛІВЫ НАСТУП

Бліскучая аперацыя «Багратыён» стала для ворага нечаканасцю. Немцы адступалі. На сваім шляху яны працягвалі разбураць дамы, узрывалі адміністрацыйныя аб'екты, палілі пакінутую маёмасць.

Партызанскія атрады, якія на працягу акупацыі мелі разрознены характар, падчас наступальнай аперацыі «Багратыён» сталі магутнай сілай. Калі ішло вызваленне сталіцы, прадстаўнікі Беларускага штаба партызанскага руху інструктавалі камандзіраў партызанскіх фарміраванняў актыўней і смялей узаемадзейнічаць з наступальнымі часцямі Чырвонай Арміі, перахапляць і рашуча грамаць варожыя войскі, што адступаюць, аўтакалоны, абозы. «Не давайце праціўніку вывозіць ваенную маёмасць і нарабаванае дабро, захоплівайце маёмасць, а пры немагчымасці — знішчайце яе», — сказана ў інструкцыі ад прадстаўніка партызанскага штаба Рыжыкава.

Першы тыдзень пасля вызвалення Мінска быў перыядам імклівага наступу Чырвонай Арміі і партызан на немцаў.

Вораг з калонамі аўтамашын, артылерыі, кавалерыі і пяхоты рухаўся па тракце ад Мінска на захад. Немцы адступалі і гналі перад сабой сотні сацвецкіх ваеннапалонных, захопленых у 1942 годзе. Гітлераўцы імкнуліся прабіцца праз Налібоцкую пушчу. Адну з такіх калон атакавала брыгада імя Сталіна, было знішчана 120 немцаў, узяты багатыя трафеі, вызвалены 600 палонных. Наступленне разгарнулася ў дзень вызвалення Мінска і ў наступныя суткі. У гэты час палова Беларусі ўжо была ачышчана ад фашыстаў. Але трэба было прайсці яшчэ сотні, каб выйсці да рубяжоў на Бузе і Нёмане. Але калі ўсход вызвалялі з канца 1943 года да пачатку ліпеня 1944 года, з заходніх раёнаў ворага гналі хутчэй — літаральна да канца ліпеня. І тут адлік ішоў не толькі на дні — на гадзіны.

КОЖНЫ ДЗЯСЯТЫ БАЕЦ — ЖАНЧЫНА

На поўначы і поўдні ад Мінска Чырвоная Армія вызваляла ўсё новыя населеныя пункты. У ліпені 1944 года на завяршальным этапе наступальнай аперацыі войскі трох Беларускіх франтоў ва ўпартых баях прынесці вызваленне Гродзеншчыне. Днём 3 ліпеня партызанская брыгада імя

Цэнтральнага камітэта Кампартыі Беларусі пад камандаваннем Мікалая Фёдарава з боем авалодала пасёлкам Астравец, разграміла варожы гарнізон і ўтрымлівала пазіцыі тры дні да падыходу часцей дзесяткай арміі.

Як расказала **следчы Астравецкага раённага аддзялення Следчага камітэта Вікторыя САПАЧ,** гісторыя брыгады пачалася ў сакавіку 1943 года. Да гэтага часу не асобныя батальёны ўваходзілі ў розныя брыгады, у тым ліку «За Советскую Белоруссию». У лютым 1944 года брыгадзе прысвоена імя ЦК Кампартыі Беларусі. Дзейнічала яна ў шэрагу раёнаў Віцебскай і Мінскай абласцей, а таксама на тэрыторыі Астравецкага раёна Гродзеншчыны. Шостага ліпеня, падчас вызвалення Астраўца, брыгада аб'ядналася з часцямі Чырвонай Арміі. Па словах Віктарыі Сапач, брыгада на той момант налічвала пяць атрадаў з агульнай колькасцю амаль 340 чалавек, з іх 34 жанчыны, большасць складалі беларусы, рускія і ўкраінцы.

Падчас вызвалення Астравецкага раёна партызанскай брыгадай камандаваў Мікалай Фёдараў, які на пачатку 1942 года быў накіраваны ў тыл ворага для арганізацыі партызанскага руху. За кароткі тэрмін Фёдараў сабраў атрад у складзе 100 чалавек. Падчас баявых дзеянняў брыгадай разгромлена некалькі моцных нямецкіх гарнізонаў у Астраўцы і на станцыі Гудагай, пашкоджана 500 чыгуначных рэек. У баях і засадах знішчана і ўзята ў палон каля 200 немцаў, атрыманы значныя трафеі.

З паведамлення сакратара Вілейскага падпольнага абкама партыі Клімава начальніку Беларускага штаба партызанскага руху Калініну: «...Брыгада М. І. Фёдарава заняла мястэчка Астравец, знішчыла каманду фашысцкіх падпальшчыкаў. Шостага ліпеня ўдарныя партызанскія групы здзейснілі нападзенне на ўчастак чыгуначнай лініі Смаргонь — Вільнюс у раёне станцыі Гудагай — Шумск. Рух па лініі спынены. У выніку на перагоне стаяць чатыры нямецкія эшалоны з грузамі, якія перадаздзены 144-й дывізіі Чырвонай Арміі». Мікалай Фёдараў за ўдзел у аперацыі атрымаў высокія дзяржаўныя ўзнагароды.

І ПЕРАСЛЕД, І ЛІКВІДАЦЫЯ ПАЖАРАЎ

Падчас акупацыі Астравецкі раён уваходзіў у зону дзеяння брыгады імя Варашылава і ЦК КП(б)Б Вілейскай вобласці. У фондах Астравецкага гісторыка-этнаграфічнага музея захоўваюцца фотаздымкі сакратара Астравецкага падпольнага райкама КПБ Вілейскай вобласці Фёдара Ларыёнава, начальніка штаба партызанскай брыгады імя Варашылава Вілейскай вобласці Івана Крысава, а таксама здымак партызан даўзенай брыгады. Па інфармацыі, якую прадставіла **дырэктар музея Рыма ПАДЛУЖНАЯ,** вызваленне Астравецкага раёна пачалося ў чэрвені 1944 года, калі вораг быў выбіты з вёскі Гервяты. Страты былі з абодвух бакоў.

А 3 ліпеня ў 19 гадзін 40 хвілін партызанская брыгада імя ЦК КП(б)Б атакавала нямецкі гарнізон каля Астраўца. Як сведчаць дакументы астравецкага музея, падчас штурму асаблівага вылучыліся байцы ўзвода разведчыкаў атрада імя Чкалава і атрада імя Пархомянкі. Нямецкія войскі не вытрымалі ўдару і адступілі пад Гудагай, перад гэтым паспеўшы падпаліць пасёлак гранатамі і вогненнымі кулямі. Поўнасцю згарэла цэнтральная частка Астраўца — ад млына да касцёла. Партызанам прыйшлося адмовіцца ад пераследу і занятыя тушэннем пажару. Іх намаганнямі ліквідаваны агонь на лесапільным і цагляным заводах, млыне, аўтарамонтнай майстэрні і іншых прадпрыемствах. У якасці трафеяў атрыманы шэсць кулямётаў, 40 вінтовак, аўтамашына, два матацыклы і два прадуктовыя склады.

За заходнія раёны Беларусі баі ішлі яшчэ тры тыдні. Жыхары акупаваных тэрыторый пакутавалі ад злачынстваў нямецкіх захопнікаў. Вораг актывізаваў тэрор і масавую эвакуацыю насельніцтва ў Германію. Знішчаліся пасевы, мініраваліся чыгуначныя аб'екты і дарогі. Аб падобным становішчы, дарэчы, паступіў рапарт у цэнтр ад камандзіра партызанскага злучэння Брэсцкай вобласці Сяргея Сікоркага. Ён характарызаваў гэты перыяд так: «Нарастае паніка сярод

нямецкіх служачых, іх сем'і пачалі эвакуацыю. Партызанскія атрады штодзень вядуць баі на камунікацыях і ў шэрагу месцаў па вырабаванні насельніцтва».

З цэнтра паступае рэкамендацыя ўзмацніць кантроль за мясцовасцю, выяўляць і знішчаць праціўнікаў. Асабліва калі тыя выходзяць у населеныя пункты. Бо недасканалы кантроль тэрыторыі дазваляе групам праціўніка пераходзіць да актыўных дзеянняў і наносіць страты часцям Чырвонай Арміі і насельніцтву.

МОСТ У МІХАЛІШКАХ

Партызанам удавалася захаваць маёмасць і жыцці людзей у тых раёнах, дзе ішло наступленне. Партызанскія брыгады актыўна злучаліся з часцямі Чырвонай Арміі. Так, тры атрады 16-й Смаленскай брыгады 5 ліпеня аб'ядналіся з дзеючай арміяй у раёне вёскі Свір, а 6 ліпеня астатнія тры атрады далучыліся да арміі ў Міхалішках.

За вёску Міхалішкі Астравецкага раёна гэтымі днямі ішлі жорсткія баі. Такая абстаноўка была абумоўлена важным стратэгічным станам населенага пункта. Партызанам было важна да прыходу арміі захаваць мост праз раку Вілію. Для выканання задання былі вызначаны тры атрады і 60 конных разведчыкаў. З кроваправалітнымі баямі 4 ліпеня атрад заняў Міхалішкі.

Немцам пасля некалькіх спроб удалося часткова разбурыць пралёты моста, аднак партызаны пры дапамозе мясцовых жыхароў яго хутка адрамантавалі. Неўзабаве па ім ужо ішлі салдаты-вызваліцелі.

Да апошняга патрона імкнуліся гітлераўцы ўтрымаць чыгуначную станцыю Гудагай. Згодна з дакументамі Астравецкага музея, ноччу партызанская брыгада імя ЦК КП(б)Б атакавала чыгунку, узарвала і разабрала больш за 200 рэек. А раніцай 6 ліпеня партызаны пры падтрымцы разведчыкаў 144-й стралковай дывізіі атакавалі станцыю і ў хадзе баёў выбілі адтуль нямецкія войскі, прымусілі іх да адступлення. Гэтым боем было завершана вызваленне Астравецкага раёна. Не абышлося без страт. У баях загінулі дзясяткі байцоў 25-й і 144-й стралковых дывізій, яны так і засталіся на гэтай зямлі.

У ПАМЯЦЬ ТЫХ, ХТО ЗАГІНУЎ

На тэрыторыі раёна знаходзіцца сем пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, дзе спачываюць 800 байцоў і мірных жыхароў. У аграгарадку Варона пахаваны 67 савецкіх воінаў. У Гервяцкім сельскім Савеце ўстаноўлены помнік невядомаму салдату, чые астанкі знойдзены ў хадзе пошукавых работ.

На ўскрайку вёскі Кемелішкі ўстаноўлены помнік аховрам мясцовага гета. Тут раскраляны 500 яўрэяў — такая лічба значыцца на манументе.

Вялікая брацкая магіла знаходзіцца ў пасёлку Гудагай. Тут, па архіўных данespecially, пахавана больш за 200 ваеннапалонных. Менавіта сюды, у Гудагай, вайна прыйшла ў першы дзень, 22 чэрвеня 1941 года. Як сведчаць гістарычныя дакументы, тады фашысты скінулі некалькі бомбаў на чыгуначную станцыю і мост праз раку Лошу.

Ваенны Гудагай вядомы тым, што тут быў створаны філіял «Шталаг 342». У ім на працягу некалькіх гадоў знаходзіліся ваеннапалонныя. Многія загінулі і пахаваны ў брацкай магіле, на месцы якой узвышаецца абеліск. На розных крыніцах тут знайшлі спа-

чын ад 200 да 300 чалавек. Імёны 75 з іх сталі вядомы дзякуючы архіўным дакументам, адкрытым у апошнія дзесяцігоддзі. Нямала ахвяр было сярод мірнага насельніцтва. У вёсках Кемелішкі і Барані стаяць помнікі на месцы расстрэлу жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці.

У Астраўцы ўстаноўлены велічны манумент савецкім воінам і партызанам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Знаходзіцца помнік у лесапаркавай зоне горада. Работы па яго ўзвядзенні былі распачаты ў 1974-м — за год да 30-й гадавіны Вялікай Перамогі.

Калі насыпалі курган пад манумент, сюды прывезлі зямлю з Брэсцкай крэпасці, Хатыні, сталічнага Кургана Славы, з месца Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, Валгарада (Сталінградская бітва), Кургана Славы Швянчонскага раёна.

Двухфігурную скульптурную кампазіцыю — воіна-сцяганосца і яго таварыша, які памірае, — вышынёй у 3,5 метра зрабіў вядомы беларускі скульптар Ярамір Печкін. Урачыстае адкрыццё мемарыяла адбылося 9 мая 1975 года.

Мемарыяльныя пліты з імёнамі каля падножжа кургана ўстанавілі пазней. А потым па меры атрымання звестак пра загінулых землякоў туды пачалі заносіць і іх прозвішчы, каб увекавечыць памяць абаронцаў. Аднаўлялі пліты два разы, апошні — у 2019 годзе.

Адразу пасля вызвалення ў Астраўцы пачалі падлік разбуранай і разрабаванай нямецкімі захопнікамі гаспадаркі. Паралельна вялося аднаўленчыя работы. З дакументаў Астравецкага Савета дэпутатаў вядома, што 1 жніўня 1944 года адбылося першае пасяджэнне выка-

наўчага камітэта, на якім разглядалі пытанні аб зборы ўраджаю і хлебанарыхтоўках, аб аднаўленні школ раёна і падрыхтоўцы да навучальнага года, аб дзяржаўнай ваеннай пазыцы.

Выканаўчым камітэтам былі прыняты рашэнні аб аднаўленні дзейнасці арганізацый і добрапарадкаванні тэрыторыі раёна, прызначэнні дапамогі шматдзетным і адзінокім маці, пажарнай бяспецы, стане гандлю, кадравыя пытанні. Дзяржава аказвала дапамогу ў будаўніцтве новых і аднаўленні разбураных дамоў, выдзяляліся ўчасткі беззямельным сялянам, арганізацыям, рабочым і служачым для падсобных гаспадарак.

Вайна ішла на захад, баі грымелі па-за межамі Беларусі, савецкія салдаты вызвалялі ад нямецкай акупацыі Заходнюю Еўропу. І, хоць мірнае жыццё пачало ўваходзіць у свядомасць людзей, памяць аб самай крывавай вайне будзе трывожыць яшчэ не адно пакаленне беларусаў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

РАЗАМ ВЫГУКНУЛІ: «РАЗМА!»

Лёс асеціна, які змагаўся з акупантамі ў партызанскім атрадзе на тэрыторыі Беларусі

Асецінская прыказка абвяшчае: калі народ адзіны, ён рухае горы. Дзясяткі прадстаўнікоў асецінскага народа змагаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны поруч з беларусамі і прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў у партызанскіх атрадах імя Чарнака і Фрунзэ. Аб адным з іх — Альбіне Канукаве, адважным сыне асецінскага народа, які пакінуў адметны след у гісторыі партызанскага руху на беларускай зямлі, — будзе наш аповед.

Пошук мае працяг

Сапраўдны гісторык ніколі не завяршае пошук. Некалькі гадоў таму даследчык з Паўночнай Асеції — Аланіі Цімур Карданаў — выпусціў у свет кнігу «Героі без Залатых Зорак», у якой на пяцістах старонках расказаў пра лёсы 50 сваіх землякоў, якіх прадстаўлялі да звання Героя Савецкага Саюза, але па розных прычынах сваіх залатых зорак яны так і не дачакаліся. Адным з іх стаў Альбін Харытонавіч Канукаў (1910—1944). Пасля выхаду кнігі Цімур Заурбекавіч захацеў яшчэ больш даведацца пра гераічнага земляка, які ў вайну змагаўся на Брэстчыне, а таму звярнуўся па дапамогу непасрэдна да Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Лукашэнкі.

У сваім лісце асецінскі гісторык пісаў: «Паважаны Аляксандр Рыгоравіч, прашу Вас максімальна аказаць садзейнічанне ў зборы матэрыялаў пра Канукава А. Х. і аб партызанах, што ваявалі з ім у брыгадзе імя Сталіна Брэсцкай вобласці».

У выніку праз Жабінкаўскую раённую ветэранскую арганізацыю, абласны краязнаўчы музей і Брэсцкую бібліятэку ім Максіма Горкага гэты ліст з просьбай дапамагі ў пошуках «героя без Залатой Зоркі» трапіў у мае рукі.

Пра прозвішча, мянушку і імя

У Альбіна было прозвішча, незвыклае славянскаму вуху, — Х'аныхъуаты. Таму з асецінскай мовы яго перайначылі на рускі манер. Гэтак атрымалася прозвішча Канукаў (з нацыскам на першым складзе).

Спрадвеку радавым гняздом Канукавых было сяло Кабан (Кабань). Адтуль яны сяліліся на свеце, часам вельмі далёка ад свайго горнага аула. Да рэвалюцыі моцна грымела слава легендарнага барца Бола Канукава. Таго нездарма звалі Асілкам і Казбек-Гарою: пяцідзесяці росце ў 228 сантыметраў Бола важыў 224 кілаграмаў і лёгка клаў на лапаткі самых моцных атлетаў Азіі і Еўропы!

Альбін КАНУКАЎ.

Казбек-Гара памёр у пасёлку Майскі (у Кабардзіна-Балкарыі), калі Альбіну было дванаццаць гадоў. Хлопчык паспеў пабачыцца са знакамітым сваяком. Успамінаючы былое, яшчэ адзін асецін, камандзір партызанскага атрада імя Чарнака Рамазан Козыраў, пісаў пра земляка, якога лічыў сябрам: «Мы яго жартоўна называлі «Бола», і ён быў задаволены...»

Альбін нарадзіўся ў Майскім 11 жніўня 1910 года ў шматдзетнай сям'і Хаматкана Канукава. Заўважым, калі юнак уступіў у шэрагі Чырвонай Арміі, яго імя па бацьку таксама змянілася: з 1932 года ён становіцца Харытонавічам. Калі вясной сорак другога асецін быў прадстаўлены да высокага звання Героя Савецкага Саюза, ва ўзнагародным лісце ўвогуле быў названы Альбертам Харытонавічам.

Пра подзвігі, палон і легіён

Ён атрымаў добрую для свайго часу адукацыю: у 1929-м скончыў Майскую дзесяцігодку. Праз тры гады ў Сталінабадзе (Душанбэ) быў прызваны ў войска, дзе трапіў у артдывізіён 7-й кавалерыйскай конна-горнай брыгады. А калі звязаў свой лёс з армейскай справай, працягнуў вучобу ў Растоўскім артылерыйскім вучылішчы.

Набліжалася ваенная навальніца, і хутка малодшы лейтэнант рушыў у паход — у Заходнюю Беларусь і на Фінскую вайну. Аднак гэта былі толькі першыя сполахі сапраўдыі сусветнага пажару.

З пачаткам Вялікай Айчыннай Альбін Канукаў — на Паўднёвым фронце, дзе рэкамендаваўся камандзірам узвода. Ён ваяваў у баях пад Самбекам і Пятроўкай, Вялікакарпінскай, Абрамаўкай і Болдыраўкай малодшы лейтэнант Канукаў і быў прадстаўлены да звання Героя. Аднак застаўся без Залатой Зоркі — атрымаў усяго толькі ордэн Чырвонага Сцяга.

А неўзабаве наменік камандзіра батарэі 185-га палка 62-й кавалерыйскай дывізіі лейтэнант Альбін Канукаў знік са спісаў асабовага складу. Доўгі час лічылася, што знік без вестак 25 мая 1942 года на Ізюм-Барвенкаўскім напрамку, у Харкаўскім катле. Аднак Альбіна чакаў іншы лёс. Шмат разоў паранены, кантужаны, беспрытомны, ён трапіў у палон у «Афлаг-365».

«Я часта захапляюся гэтым чалавекам, — расказаў камандзір партызанскага атрада імя Чарнака Рамазан Козыраў. — Калі ўпершыню пабачыў яго ва Уладзімір-Валынскім лагеры для ваеннапалонных афіцэраў, ён быў падобны на хадзячы шкілет — скура ды косці. На выцвілай армейскай гімнасцёрцы ззяду пад лапаткамі жаўцелі два кругі, як чайныя талеркі, засохлай крыві. Яго лёгкія наскрозь былі прабітыя, кулі выйшлі крыху вышэй за лапаткі. Мы ўсе былі ўпэўнены, што ён памрэ, не вытрымае ўсе жахі лагернага жыцця, дапамагалі яму чым маглі. Аднак ён не падаў духам, павольна, але папраўляўся, падбадзёраваючы іншых».

У лагеры Козыраў і Канукаў арганізавалі падпольную антыфашысцкую групу, у якую ўвайшлі землякі-асеціны. У прыгарадзе Варшавы Вясоле (цяпер усходні раён польскай сталіцы) яны ўступілі ў 835-ы батальён Паўночна-Каўказскага легіёна і пачалі рыхтаваць пераход на бок партызан.

Вясной 1943 года легіянеры трапілі ў Беларусь. Размясціліся ў вёсцы Пугачова (цяпер — частка Брэста) і праз падпольшчыцу Ганну Гутко ўстанавілі сувязь з «чарнакоўцамі». 23 мая каля 40 асецінаў, прыхапіўшы зброю і патроны, рушылі ў Шэбрынскі лес, дзе іх сустрэў камісар атрада імя Чарнака Леанід Зяленін.

Пра партызанскія будні і пасмяротную памяць

Ужо праз два дні асеціны мелі баявое хрышчэнне. Гэты выпадак камандзір брыгады імя Сталіна Сумбат Арзуманян назваў прыкладам партызанскай хітрасці.

25 мая 1943 года быў знішчаны паліцэйскі ўчастак у сяле Азяты Жабінкаўскага раёна, і асеціны прынялі ў гэтай справе самы дзейсны ўдзел. А сёмай гадзіне раніцы партызаны ў нямецкай форме накіраваліся да пастарунка. Іх віталі паліцаі, якія вырашылі, што перад імі — немцы. Пераапранутыя партызаны занялі зручныя пазіцыі, каб не даць магчымасці паліцэйскім падысці да зброі. Чакалі толькі каманды. І яна прагучала па-асецінску: «Разма!» (што значыла: «Наперад!»). У лічаныя хвіліны пастарунак апынуўся ў руках партызан, якія пакаралі здраднікаў і ўзялі багатыя трафеі.

Кіраўнікі аперацыі занялі высокія пасады: Рамазан Козыраў узначаліў партызанскі атрад імя Чарнака, а лейтэнант Канукаў — атрад імя Фрунзэ. Гэтыя фарміраванні ў складзе брыгады імя Сталіна актыўна дзейнічалі ў Жабінкаўскім, Кобрынскім, Маларыцкім раёнах. Альбін Харытонавіч неаднаразова праяўляў асабістую мужнасць. За гэта быў паўторна адзначаны ордэнам Чырвонага Сцяга і медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. На жаль, насіць яму гэтыя ўзнагароды не давялося...

У лютым сорак чацвёртага адбыўся трагічны выпадак. Пра тое расказаў гісторык Цімур Карданаў. Ішлі заняткі, на якіх партызаны вывучалі новую міну. Інструктар памыліўся, прагрымеў выбух. Чацвёра партызан загінулі на месцы, камісара атрада Аляксандра Гогалева, які глядзеў у акно, разам з рамай выкінула на вуліцу. Падчас выбуху старшы лейтэнант Канукаў быў ззаду групы і назіраў за інструктарам. Хваля адкінула камандзіра фрунзенцаў назад. Ён ударыўся аб сцяну і страціў прытомнасць. 19 лютага з партызанскага аэрадрома каля вёскі Сварынь Драгічынскага раёна яго накіравалі на Вялікую зямлю. Ён некалі ў лагеры, Альбін не губляў прысутнасці духу, паабяцаў на развітанне Козыраву: «Буду ў Асеці, зайду да тваіх маці і сястры, раскажу ім усё пра цябе».

«Так я згубіў самага лепшага сябра. Гэта была наша апошняя сустрэча», — успамінаў праз гады Рамазан Дзабіевіч.

Альбін Харытонавіч памёр 19 кастрычніка 1944 года. Раненыя ўрачы крыху заляжылі яго раны, але надта шмат адмецін пакінула вайна на целе і ў душы.

Канукаў вярнуўся дамоў, прыбыў на вечную пабыўку з палескіх нізін — у край сівых, як свет, каўказскіх вяршынь. Ён вярнуўся туды, дзе самая высокая гара — Казбек, а самы высокі чалавек — Казбек-Гара. Ён вярнуўся, каб застацца там, дзе радзіма, дзе шмат гор і бліжэй да зор.

Анатоль БЕНЗЯРУК, фота з архіва аўтара.

Іван АЛЕКСІЕВІЧ з праўнукам (*фота аўтара*).

Замест эпілога

АПОШНІ ПАРТЫЗАН

14 снежня 2023 года памёр Іван Аляксандравіч Алексіевіч — апошні жабінкаўскі ветэран вайны. А праз некалькі дзён Цімур Карданаў змясціў пра яго артыкул у газеце «Северная Осетия». Асецінскі гісторык і беларус-ветэран завочна былі крыху знаёмыя, размаўлялі па відэасувязі. Іван Аляксандравіч сведчыў: «У нашым атрадзе было нямала асецінаў. Яны не ведалі, што такое страх, усе ваявалі адважна. Бязлітасныя былі да акупантаў, асабліва да здраднікаў. Камандзірам у нас быў Козыраў, камісарам — Канукаў, а Еламурза Міцілаў па мянушцы Тыгр узначаліў разведгрупу».

Пры дапамозе Івана Алексіевіча даследчык з Асеції папоўніў спіс землякоў, што змагаліся з ворагам на Брэстчыне. Цяпер, акрамя нашага героя Альбіна Канукава, вядомы яшчэ 44 прозвішчы: Султан Агаеў, Тасалтан Агузараў, Татары Бігаеў, Магамет Бічылаў, Аляксандр Браеў, Агубе Будаеў, Андрэй Будаеў, Шміт Будаеў, Аляксандр Бурзіеў, Канстанцін Варзіеў, Каўрбек Варзіеў, Таймураз Газаеў, Татаркан Гаджыеў, Батырбек Дзабіеў, Махарбек Дзусаў, Мікалай Дкыгкаеў, Андрэй Еналдзіеў, Міхаіл Зангіеў, Міхаіл Кабалоеў, Махарбек Кадзаеў, Дзмітрый Казаеў, Пётр Камбалаў, Міхаіл Канукаў, Канстанцін Караеў, Рамазан Козыраў, Додці Койбаеў, Васілій Кокаеў, Махарбек Колієў, Асман Кудзіеў, Ахцемір Кулаў, Пётр Купееў, Еламурза Міцілаў, Аўардан Перысаеў, Каспалат Рубаеў, Барыс Скяеў, Тэрмен Татараў, Маірбек Таўціеў, Хазбі Тоцікаў, Лазар Туаеў, Саламон Цагараеў, Тахір Цаўкаеў, Мурадзін Цемурканаў, Барыс Цкаеў і Георгій Цопанаў.

Свой артыкул Цімур Карданаў завяршыў словамі: «Мінае незваротна час, сыходзяць апошнія героі, якія не шкадавалі ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны свае жыцці за нашу вялікую Радзіму — Савецкі Саюз. Адным з такіх герояў быў сын беларускага народа Іван Алексіевіч, якога лёс звязаў з асецінамі».

Закрытое акционерное общество «Белорусско-Швейцарский банк «БСБ Банк»
www.bsb.by

ЗАО «БСБ Банк»
Финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2023 года

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ

В тысячах белорусских рублей	Примечание	31 декабря 2023 года	31 декабря 2022 года
АКТИВЫ			
Денежные средства и их эквиваленты	6	738 390	559 662
Драгоценные металлы	7	5 043	3 725
Финансовые активы, учитываемые по амортизированной стоимости, в том числе:			
Средства в финансовых организациях	8	11 116	8 489
Кредиты клиентам	9	36 397	30 692
Ценные бумаги	10	41 799	55 512
Финансовые активы, оцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток	11	7	1 409
Финансовые активы, оцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход	12	71 788	44 740
Активы в форме права пользования	13	3 521	2 700
Основные средства и нематериальные активы	14	29 393	23 075
Отложенные активы по налогу на прибыль	34	6 661	3 204
Прочие активы	15	40 763	27 529
ИТОГО АКТИВЫ		**984 878**	**760 737**
ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ			
Обязательства			
Финансовые обязательства, учитываемые по амортизированной стоимости, в том числе:			
Средства финансовых организаций	16	146	57
Средства клиентов	17	826 663	633 344
Субординированные займы	18	16 213	13 396
Финансовые обязательства, оцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток	19	263	
Обязательства по договорам аренды	20	3 642	2 762
Привилегированные акции	21	-	1 200
Прочие обязательства	22	12 024	12 102
Итого обязательства		**858 951**	**662 861**
Капитал			
Уставный капитал	23	47 553	46 353
Фонд переоценки финансовых активов, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход	23.1	1 560	(3 833)
Накопленная прибыль		76 814	55 356
Итого капитал		**125 927**	**97 876**
ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ		**984 878**	**760 737**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

В тысячах белорусских рублей	Примечание	2023 год	2022 год
Процентные доходы	24	18 993	18 998
Процентные расходы	24	(2 723)	(6 635)
Чистые процентные доходы		**16 270**	**12 363**
Комиссионные доходы	25	75 040	41 890
Комиссионные расходы	26	(29 707)	(16 751)
Чистые комиссионные доходы		**45 333**	**25 139**
